Лідзія Мартынюк ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Юбілей ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 05 (2699) Год LIII | Беласток, 3 лютага 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Сацыёлаг — упаўнаважаным

(Злева) Ян Чыквін, Яўген Вапа, Юры Хмялеўскі, Алег Латышонак

Правесці сустрэчы з прадстаўнікамі кожнай арганізацыі нацыянальных меншасцей падляшскага рэгіёна ды склікаць раду, вырашаючую праблемы — гэтага хочуць новы ўпаўнаважаны падляшскага ваяводы па справах нацыянальных і этнічных меншасцей Мацей Тэфэльскі і сам ваявода Мацей Жыўна.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

За апошнія больш за два гады пасада ўпаўнаважанага па справах нацыянальных і этнічных меншасцей пры падляшскім ваяводзе (у час знаходжання пры ўладзе ваяводы, а сённяшняга сенатара ПіС, Багдана Пашкоўскага) была вакантнай, хоць адпаведныя ўказанні Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі патрабавалі назначэння. У той час прадстаўнікі меншасных арганізацый Падляшша маглі толькі скардзіцца на форуме супольнай камісіі ўрада і гэтых арганізацый. Апошнім упаўнаважаным быў шматгадовы працаўнік аддзела прэсавай службы Гарадской управы г. Беластока Лешак Калеснік. Перастаў ён быць на гэтай пасадзе з грукатам пасля таго, як ад імя свайго тагачаснага начальніка — першага ваяводы ад ПіС Яна Дабжынскага (цяпер ужо сенатара) — „намаўляў" прадстаўнікоў меншасных арганізацый падтрымаць свайго шэфа, якому ведамства ўнутраных спраў і адміністрацыі прад'явіла вотум недаверу. Папярэднікам Лешка Калесніка, у час кіравання СЛД, быў Марэк Лібэрадзкі, якога цяперашні ваявода з 1 студзеня назначыў сваім упаўнаважаным па справах няўрадавых арганізацый. Дарэчы, меншасныя арганізацыі фармальна, у адпаведнасці са статутамі, якраз з'яўляюцца няўрадавымі арганізацыямі.

Паўтарагадзіннае спатканне з упаўнаважаным Тэфэльскім і ваяводам Жыўнам пачалося ад скрыгату. Прэс-сакратарка ваяводы, былая журналістка „Газеты вспулчэснай" Іаланта Гадэк, убачыўшы ў канферэнц-зале Ваяводскай управы, дзе праводзілася сустрэча, штатыў тэлекамеры ўкраінскай каманды Тэлебачання Беласток, рашуча загадала ёй пакінуць месца, звяртаючыся таксама да апошніх сабраных прадстаўнікоў меншасцей, а часта таксама і СМІ (меншасных):

— Гэтая сустрэча закрытая для журналістаў. Прэс-канферэнцыя адбудзецца праз дзве гадзіны. Прашу вас пакінуць гэтую сустрэчу, паколькі я не буду ў парадку ў адносінах да іншых журналістаў, запрошаных на пазнейшы час.

„Ніва" звярнула ўвагу:

— Спадарыня прэс-сакратар, гэтую залу вымушаны былі б пакінуць шмат прысутных, бо яны дзеячы меншасных арганізацый і заадно журналісты.

Прэс-сакратарка Гадэк саступіла. Ваявода пачаў сустрэчу:

— Я хацеў бы распрацаваць прынцыпы супрацоўніцтва, між іншым вызначыць, ці нашы сустрэчы будуць запісвацца медыямі. Я хачу, каб нашы кантакты былі сапраўднымі і празрыстымі.

Дэкларава ён, што будзе „з пакорай шукаць вырашэнняў праблем меншасцей". Прызнаўся, што ягоная сям'я паходзіць з Гродна, а ягоны бацька „навучыў пашаны для кожнага народа":

— На ўступе прашу вас даць мне мандат даверу.

— Я займаўся шматкультурнасцю паўночна-ўсходняга рэгіёна. З'яўляюся тыповым навукоўцам, — рэкамендаваў сваю асобу Мацей Тэфэльскі, супрацоўнік Інстытута сацыялогіі Універсітэта ў Беластоку.

Як казаў, пастараецца ён „у час індывідуальных сустрэч выпрацаваць праграму далейшых дзеянняў" і тады выпрацуе „ключ, які дазволіць склікаць спраўную, супольную раду". Ваявода ў сваю чаргу, спасылаючыся на пастулаты, якія выносіліся ў час папярэдніх, падобных сустрэч, гарантаваў:

— Дакументы пасля гэтых сустрэч не трапілі ў паперарэзку. У час індывідуальных сустрэч асвяжым тыя праблемы. Вядома, не з усім удасца справіцца, не ўсе справы знаходзяцца ў кампетэнцыі ваяводы. Прашу адкрыцца на майго ўпаўнаважанага. Прашу не трактаваць яго так, быццам бы я хачу займацца белай разведкай.

Сустрэчу, так як бывала і раней, пачаў Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ і віцэ-старшыня Таварыства беларускай культуры:

— Ці можам разлічваць на вас як пасрэдніка ў адносінах да дзяржаўнай улады і на тое, што вы будзеце супрацоўнічаць з самаўрадамі розных узроўняў? — пытаўся.

Ваявода, як можна было спадзявацца, гарантаваў, што будзе.

Старшыня Сычэўскі, не першы ўжо раз, наракаў таксама:

— МУСіА [меншасныя арганізацыі цяпер падпарадкаваны гэтаму ведамству; раней — Міністэрству культуры — М. Х.] у адрозненне ад Міністэрства культуры трактавала нас дагэтуль прадметна, а не суб'ектна.

Пры нагодзе зноў паскардзіўся на мізэрнасць грошай на мерапрыемствы арганізаваныя БГКТ і ТБК.

— Фармалістыка пры падаванні заяў — проста шалёная.

Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза ў РП, старшыня Праграмнай рады і галоўны рэдактар тыднёвіка „Ніва" прыгадаў:

— У нас сумны вопыт звязаны з функцыяй упаўнаважанага ваяводы па справах меншасцей і ад такіх сустрэч, якія вынікаюць, дарэчы, з неабходнасці за-

працяг ☞ 11

Па адной вуліцы ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Днямі знаёмы расказаў, што жэніць сына. Пайшоў ён замаўляць музыку і запытаўся ў вясельных выканаўцаў пра беларускі рэпертуар. Тыя вельмі здзівіліся і запрапанавалі ажно тры песні... папольску. Рускамоўная экспансія паглынае беларускую тоеснасць...

Я не маляваў для грошай! ☞ 4

Ганна КАНДРАЦЮК



Гісторыя помніка зубру ☞ 8

Пётр БАЙКО

У арлянскай Гміннай радзе ☞ 13

Міхал МІНЦЭВІЧ

9 770546 196000

Па адной вуліцы

Каб зразумець, дзе і ў якім стане апынулася Беларусь на пачатку трэцяга тысячагоддзя, дастаткова прыехаць у Гродна і прайсці па адной вуліцы — ад чыгуначнага вакзала да цэнтра горада. Вуліца гэтая была даўней адной з найбольш прыгожых у горадзе над Нёманам, некалі насіла назву Раскоша, пра што сведчаць некаторыя старадаўнія будынкі і адметны брук. У пачатку дваццатага стагоддзя захопнікі-чужынцы назвалі яе імем Мураўёва-вешальніка — адной з найбольш пачварных постацей у гісторыі Беларусі, імем знішчальніка і ката. Пазней вуліца прыдбала іншае імя — беларуска-польскай пісьменніцы Элізы Ашэшкі, якая пакінула пасля сябе ў пакаленняў гараджан добрую памяць. Называецца яна так і дагэтуль.

Ужо на чыгуначным вакзале можна адчуць русіфікацыю горада. Вакзальныя абвесткі ад'езду цягнікоў двухмоўныя — іх аб'яўляюць па-руску і на зрусіфікаванай беларускай мове. Адчуванне ад такога дзікага білінгвізму паскуднае. Ідучы ад вакзала па вуліцы Ажэшкі, трапляем у кнігарню. 95 адсоткаў прадаваемых кніг — па-руску, каля 5 — па-беларуску. Гэта рэальная карціна кніжнага рынку краіны. У кіёску аніводнай газеты па-нашаму, спрэс адны „комсомолки" ды „вечёрки". Далей па левым баку вуліцы магазін „Московский", а побач кафэ „Москва" (якая глыбокая фантазія і разнастайнасць у назвах!). Не сумнявайцеся, што аналагічных шыльдаў-найменняў (прыкладам „Кіеўскі", „Сафійскі" ці „Пражскі" ў горадзе няма). Замыкае трыяду будынкаў галоўны праваслаўны храм горада — Пакроўскі сабор. Ні ў царкве, ні ў гандлёвым шапіку ні слова па-беларуску. Нібыта і не было стагоддзяў гісторыі ўласна беларускага праваслаўя. Далей будынкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, пра які сённяшнія студэнты, іх бацькі і сваякі расказваюць сапраўдныя жахі. Такіх парадкаў і завядзёнак, якія пануюць у гэтай навучальнай установе, знайсці яшчэ дзе-небудзь цяжка. Зразумела, што універсітэт за апошнія дзесяць гадоў зрусіфікаваны ўшчэнт. Бедны Янка Купала, імем якога прыкрытая такая „вышэйшая" адукацыя! Затое новыя „мураўёвы", напэўна, не нацешацца — „чего не сделает русский штык, доделает русская школа".

Прайшоўшы яшчэ далей, можна трапіць да будынкаў абласнога і гарадскога выканкамаў. Тут сядзяць „слугі народа", якія праводзяць у жыццё генеральную палітыку па знішчэнні ўсяго адметнага і нацыянальнага, якія робяць з Гродна яшчэ адну „кострому". Два месяцы бацькі дзяцей не могуць дабіцца ад гарадской улады дазволу на інфармацыйную рэкламу па стварэнні беларускамоўнага садка! Кожнага беларускага слова баяцца як агню, за кожным беларускамоўным чалавекам сочаць як за тэрарыстам. Як назваць такую ўладу? Як назваць тых, што ёй служаць? Як растлумачыць такое дзікае стаўленне чыноўнікаў, міліцыі і спецслужбаў да сваіх суграмадзян? Падобнага калабарцыянізму ў Еўропе за апошнія сто гадоў не было напэўна.

Паводле апошняга перапісу насельніцтва пераважную частку насельнікаў горада над Нёманам складаюць беларусы, на другім месцы ідуць палякі. У малых грамадскіх, пераважна інтэлігенцкіх, асяродках яшчэ размаўляюць па-свойму. Але ў цэлым людзі адцураюцца сваёй роднай мовы на карысць чужынскага, агрэсіўна-варожага. Паўсюдна, татальна і фатальна, дамінуе расейшчына. У крамах маладыя прадавачкі-дурнічкі смяюцца, калі звяртаешся па-беларуску, у кавярнях многія афіцыянткі не разумеюць, што такое кава і гарбата. Днямі знаёмы расказаў, што жэніць сына. Пайшоў ён замаўляць музыку і запытаўся ў вясельных выканаўцаў пра беларускі рэпертуар. Тыя вельмі здзівіліся і запрапанавалі ажно тры песні... па-польску. Рускамоўная экспансія паглынае беларускую тоеснасць. Такая палітыка з маскоўскага Крамля, такая дзяржаўная (правільней сказаць антыдзяржаўная) палітыка з Мінска, такая жорсткая рэчаіснасць. І ўслед за творцам хочацца крычаць: „Падыміце вочы, рабы!".

На вуліцы Ажэшкі двухбаковы рух. А гэта значыць, можна ехаць і ісці ў розныя бакі...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Хто вінаваты?

Давайце яшчэ раз прыглянемся Расіі, рускаму народу і папрабуем вызначыць ступень адказнасці іх за найгоршыя перыяды іх гісторыі.

У мінулым Расія мела як перыяды ўзлётаў, за якія расіяне маюць права ганарыцца, так і, на жаль, перыяды, за якія ім трэба моцна чырванець. Але ці толькі самі расіяне за свае чорныя перыяды павінны саромецца?!

Да найгоршых часоў, проста экстрэмальных, бо несправядлівых, галодных і крывавых, залічым бясспрэчна савецкі перыяд. Але і ў той час былі, канешне, лепшыя і горшыя перыяды.

Ужо сама рэвалюцыя была вялікай бядой; грамадзянская вайна — яшчэ горшай.

Хто рыхтаваў у Расіі рэвалюцыю, кіраваў ёю і пазней савецкай дзяржавай? Расіяне? Не, міжнацыянальная мафія рэвалюцыянераў-тэрарыстаў. Былі, канешне, і сярод рэвалюцыянераў людзі чэсныя, высакародныя, але калі яны не ўспелі згінуць у полымі рэвалюцыі, то іх ліквідавалі потым. Тая ж самая рэвалюцыйная мафія.

Галоўныя падрыхтоўшчыкі і кіраўнікі рэвалюцыі — Ленін і Троцкі. Хто яны па нацыянальнасці? Адзін не зусім рускі, а другі — зусім не рускі.

У час рэвалюцыі і ў вельмі цяжкія паслярэвалюцыйныя гады іх галоўным памагатым быў Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі. А хто ён па нацыянальнасці?

Гэта ён, Дзяржынскі, стварыў найбольш злачынную і крывавую арганізацыю ЧК і кіраваў ёю. Угробіла яна мноства нявіннага народу. Яна стала проста ўзорам для фашысцкіх злачынных арганізацый.

Не меншым злачынцам быў і яго нацыянальны сабрат Андрэй Вышынскі, за подпісам якога расстрэльвалі нявінных людзей.

Пасля Леніна і Дзяржынскага кіраўнічы руль савецкай дзяржавы перанялі яшчэ страшнейшыя монстры — Сталін і Берыя. Гэта яны не толькі палітычную паліцыю, але ўвесь савецкі дзяржаўны апарат ператварылі ў злачынную структуру — і пайшло-паехала... астаўляючы за сабой крывавы след. І ў гэтых пачвараў радаслоўе не рускае.

Сярод гэтай крывавай публікі нямала было, канешне, і рускіх, можа нават найбольш, бо адбывалася гэта на тэрыторыі Расіі, Савецкага Саюза. Але сярод найбольш зверскай, д'ябальскай вярхушкі, думаю, на шчасце для рускіх, аказаліся не яны.

Вось як (паводле „Беларуса" № 406 ад кастрычніка 1993 г.) выглядала, напрыклад, вярхушка рэспубліканскай службы ўнутранай бяспекі Беларусі, распачынаючы з ЧК праз ГПУ, НКВД да КДБ, у нацыянальным сэнсе. Гэта значыць, ад рэвалюцыі да дзевяностых гадоў, часоў незалежнасці Беларусі. Начальнікамі гэтай злачыннай арганізацыі былі: 9 — рускіх, 4 — яўрэі, 3 — палякі, 2 — латышы, 1 — грузін. І ніводнага беларуса.

Відаць, падобна было і ў іншых рэспубліках. Проста, крамлёўская вярхушка баялася ставіць сваіх над сваімі.

Ці можна тады за мінулыя злачынствы мець прэтэнзіі да нейкай канкрэтнай нацыі? Па-мойму — не. У кожным народзе ёсць людзі і скаціны.

А цяпер прыгляньмася яшчэ аднаму радаслоўю, якое да нашага сюжэта мае непасрэдныя адносіны.

У 1839 годзе ў сям'і польскага шляхціча Міхала Пржавальскага Смаленскага павета нарадзіўся сын, якому далі на імя Мікалай. Ён стаў ваенным і даслужыўся да звання генерал-маёра. Быў таксама выдатным рускім падарожнікам і даследчыкам Цэнтральнай Азіі, ганаровым членам Пецярбургскай Акадэміі Навук, Рускага геаграфічнага таварыства і многіх рускіх і замежных навуковых таварыстваў. У 1891 годзе ў яго гонар быў устаноўлены сярэбраны медаль і прэмія яго імя, а ў 1946 годзе — залаты медаль. Яго імем названа вёска, горад, вуліцы, вяршыні гор. Аставіў па сабе таксама многа выдатных навуковых прац.

Так сцвярджае Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Значыць, быў ён прызнаным вайскоўцам і навукоўцам, і карыстаўся папулярнасцю як у царскай Расіі, так і ў Савецкім Саюзе.

Але гэта яшчэ не ўсе заслугі Мікалая Пржавальскага. Ёсць яшчэ яго заслуга, пра якую і Энцыклапедыя маўчыць, але не маўчаць народныя пераказы і, падобна, партыйныя дакументы. Аставіў генерал і вучоны па сабе няшлюбнага сына. І хоць генеральскае прозвішча носяць і вёска, і горад, і вуліцы, і горы, і нават ёсць конь Пржавальскага, то яго сын называўся Джугашвілі, а пасля Сталін. Так, так — Іосіф Сталін...

Цяжка, канешне, у гэта паверыць, але глянуўшы на партрэт Мікалая Пржавальскага на 577 старонцы той жа Энцыклапедыі, усё становіцца ясным. Не Вісарыён быў бацькам Сталіна, а наш Мікалай. Вось вам і наступны польскі след у расійскай гісторыі.

Аб гэтым паведаміў польскім таварышам Мікіта Хрушчоў у час свайго візіту ў Польшчу. Відаць, каб паказаць, што за сталінскія злачынствы больш вінаватыя палякі, чым рускія, бо Сталін — паляк-паўкроўка.

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Цуд з касай

Можа, памятаеце, як тыдзень таму пісаў я ў „Вачах" аб грашах, якія Сенат РП знайшоў на рэвалярызацыйна-рамонтныя працы ў ансамблі манастырскіх будынкаў у Супраслі. Гаворка тут пра паўтара мільёна злотых. На мінулым тыдні было ўжо канчаткова вядома, што Сейм сенацкую папраўку прыняў. Фармальна дэпутаты галасавалі за тое „каб адкінуць папраўку", што, на маю думку, не мае значэння. Асабліва таму, што маладыя ў так сфармуляваным маршалкам Ніжэйшай палаты заахвочванні да галасавання маглі разгубіцца. Прасцей было б, на маю думку, спытацца: „Хто за прыняццем папраўкі?". Ды не мне аб гэтым вырашаць. Так ці інакш, за назначэнне манастыру грошай выказаліся прысутныя дэпутаты ад ГП, ПСЛ і ЛіД, а таксама незалежныя. За тым, каб адкінуць папраўку, значыць, супраць далейшага фінансавання Супрасльскага манастырскага ансамбля, прагаласавала 11 дэпутатаў ад ПіС. Самае цікавае, што ў галасаванні не прыняло ўдзелу аж 50 дэпутатаў. Агулам 314 паслоў Сейма пагадзіліся з папраўкай сенатараў, супраць было 11, 105 устрымаліся ад голасу. Я праверыў, як галасавалі падляшскія дэпутаты ад ПіС, партыі, якую яшчэ пасля галасавання ў Сенаце мясцовая прэса (пры дапамозе падляшскіх палітыкаў апазіцыйных да ПіС груповак) папракала ў спробе блакіравання гэтай прапановы. З ліку падляшскай ПіСаўскай сямёркі, трох было — каротка кажучы — за Супраслю (м.інш. былы віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі, адказны ў той час за нацыянальныя меншасці Яраслаў Зялінскі), устрымалася ад голасу двух (сярод іх былы беластоцкі прэзідэнт Кшышаф Юргель), адзін быў непрысутны (віцэ-маршалак Сейма Кшыштаф Путра), а адзін прагаласаваў супраць. Гэтым апошнім аказаўся малады беластоцкі парламентарый, прэс-сакратар дэпутацкага клуба ПіС Марыюш Камінскі. Я спытаўся ў яго, чаму так прагаласаваў:

— Я проста памыліўся. Я з'яўляюся прыхільнікам аднаўлення манастырскага ансамбля ў Супраслі і не трактую гэтага ў рэлігійных катэгорыях. Калі маюцца грошы на іншыя помнікі такога класа ў Польшчы, чаму б іх не даць і на гэты.

Пасля сеймавага галасавання супрасльскай папраўкі мне не давала спакою як гэта здарылася, што ўжо ў першым чытанні сёлетняга бюджэтнага закону ў Сейме, толькі ў Сенаце, раптам, знайшліся грошы на гэтую мэту. Адкуль? Бюджэт жа ж не з гумы, нават калі гаворка пра невялікія — цэласна гледзячы на дзяржаўны бюджэт — квоты. Асвяціў мяне віцэ-маршалак Сената Збігнеў Рамашэўскі (ПіС):

— Гэта быў чыста палітычны прыём, — патлумачыў. — Вынялі тыя грошы са сродкаў на аднаўленне помнікаў, якія знаходзяцца ў Міністэрстве культуры і нацыянальнай спадчыны. З тае квоты быў створаны новы мэтавы рэзерв у 83 частцы бюджэту: мэтавыя рэзервы. Пазней тое паўтара мільёна зноў вернецца ў МКіНС.

Так вось, як мяркую з выказвання віцэ-маршалка Сената, знайшліся грошы, якія і так ужо былі. Таму не вельмі разумею задавальнення, якім дзяліўся са мною і іншымі журналістамі ў свой час дэпутат і лідэр падляшскай ГП Роберт Тышкевіч. У дзень да галасавання ў Сенаце цешыўся ён радаснай навінай:

— Мы знайшлі грошы ў бюджэце на Супрасль!

Не пішу аб гэтым замяшанні з грашыма на аднаўленне Супрасльскага манастыра, каб чапляцца. Несумненна, добра, што грошы на гэтую мэту будуць незалежна ад таго, як дабіраліся да гэтых бюджэтных „адкрывальных прац", нават калі цяпер кіруючая партыя прабуе прытварацца добрым дзядзечкам.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Усёй душой з роднай культурай

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Лідзія Мартынюк, загадчыца Вясковага дома культуры ў Рыбалах, хоча мне расказаць адразу ўсё пра дзейнасць сваёй установы. А дзейнасці тае многа, як дрэў у лесе. І грунт тут для такой дзейнасці ўраджайны, і плён плённы — культурны гушчар. І яна мне расказвае адразу і пра тое, і пра сёе... Аж губляюся ад таго мноства, як ад буйнага запою... Прашу крыху перадышкі, але ж гэтая няўрымслівая жанчына зноў набірае тэмпы, зноў уцягвае мяне ў расказ, як у якую польку-скакуху, і зноў я ў галавакружэнні, зноў губляю арыенціры, як ад буйнага запою... І мроіцца мне, што на пасадзе ў Рыбалах не Лідзія Мартынюк, толькі ўся ейная душа-анёл, што я не ў Рыбалах, а ў раю.

Фота з архіва Вясковага дома культуры ў Рыбалах

Лідзія Мартынюк з Юстынкай і Міркам Давідзюкамі

Лідзія Мартынюк пачынала свой шлях у дарослае жыццё прадаўшчыцай у вясковай краме ў сваіх родных Рыбалах, маючы за сабою сельскагаспадарчую адукацыю. Загадчык строгі быў, трэба было асцерагацца. Выстройвалася доўгая чарга за хлебам, а яна паціху, каб шэф не бачыў, падкажа жанчынам нагатовіць грошы і раз-раз хутка хлеб прадасць. І чаргі ўжо няма...

У Беластоку будавалі новы жыллёвы квартал, бетонныя блокі, а драўляныя будынкі з таго месца зносілі. Купілі Рыбалы адну такую хату, купілі там жа і Войшкі, на святліцы. Рускае войска, што ў Беластоку тады стаяла, перавезла ў Рыбалы той будынак. Вяскоўцы паставілі святліцу, зрабілі сход.

Былі дзве кандыдаткі на пасаду святліцовай; выбралі мяне, — кажа спадарыня Лідзія. — А я ж па ральнічай школе... І гавару так з Валяй Ласкевіч, што штось трэба рабіць. І яна мне кажа: пачні ад стварэння калектыву, збірай людзей, а я табе інструктара аформлю. І пайшла я з мужам ад хаты да хаты па Рыбалах шукаць людзей, што добра спявалі. І вяскоўцы ўключыліся ў арганізацыю мастацкага калектыву — Мікалай Ігнацюк сам падшукаў лепшых сяброў-спевакоў; і так калектыў будаваўся. Спярша ўдалося сабраць мешаны калектыў — былі і жанчыны, і мужчыны. Прыехала Валя з Нявінскім і пачаліся рэпетыцыі. За два месяцы Нявінскі нарыхтаваў песні і наш калектыў адразу стаў дабівацца поспехаў. Праходзіў час, у калектыве асталіся толькі мужчыны. Думалі, як назваць калектыў, але выручыла нас публіка, якая нашых мужчын ахрысціла „Хлопцамі-рыбалоўцамі". І яны праславіліся беларускімі песнямі, выступаючы на беларускіх фэстах. Але не толькі беларушчыны трымаліся, адкрытыя былі; мы тут першыя экуменічныя дажынкі наладзілі, разам з Барбарай Цірук. Мінулі гады, маладыя пакідалі вёску і калектыў, старэйшыя паміралі або занядужвалі. Астаўся, па сутнасці, толькі мой муж, няма з кім спяваць і калектыў спыніў дзейнасць.

У той час я зацікавілася тэатрам — працягвае расказ Лідзія Мартынюк — і Барбара Пахольская з Ваяводскага асяродка анімацыі культуры запрапанавала мне супрацоўніцтва з Дамінікай Вайтовіч-Краузе. І пані Дамініка ўвяла мяне ў свет тэатра. Аднойчы паказала, як зрабіць ляльку. Я, вярнуўшыся дадому, сама такую ляльку выканала і завезла паказаць. Яна пабачыла, падказала як пазбягаць недахопаў. Пазней прыязджала да нас, тлумачыла як арганізаваць лялечную сцэну. А я ўсё пільна слухала яе і прыглядалася як абыходзіцца з лялькамі. І нарыхтаваная з дапамогай пані Дамінікі казка ў пастаноўцы нашых дзяцей узяла першае месца.

Другую казку я ўжо ўсю сама рыхтавала з дзяцьмі — дадае — бо акцёры павінны самі ўсе лялькі выканаць. Атрымалася ў нас крыху завялікая гусь і нам было прысуджана другое месца. І пані Вайтовіч-Краузе дзівавалася: „Jestem zdziwiona, bo ta dziewczyna o nic mnie nie pytała!" Гэтым разам занялі мы другое месца, саступаючы Беластоку, які рыхтавала прафесійная акторка. Прайшла я курс лялечнага мастацтва, ладжаны ВААКам. Пасля пані Дамініка адышла на пенсію, пераехала ў Быдгашч, але адтуль перапісвалася яшчэ са мною. Тыя лялечныя групы давалі спектаклі, ездзячы на спецыяльным зялёным аўтобусе. І калі пані Дамінікі ў Беластоку не стала, пачаў той тэатр згортвацца, заніклі конкурсы. Але тэатрам зацікавілася Беларускае грамадска-культурнае таварыства і мы сталі падключацца да яго. Мы ж засвоілі ўжо былі ўсе азы лялечнага мастацтва, самі дзеці тут лялькі выраблялі, склейвалі, шылі... І бацькі памагалі, бо працы было мноства. Палову аўтобуса займалі нам адны рэквізіты — бо ж і рэквізіты таксама іграюць свае важныя ролі, а другую палову — дзеці... У нас былі ўсе выгады, бо тут, у Рыбалах, і школа беларуская была, і настаўнікі ахвотна падключыліся да новай ініцыятывы, падказвалі прапановы...

Пасля завяршыла я, арганізаваны ВААКам, двухгадовы курс у рамках Культурна-асветнай студыі па спецыяльнасці рэкрэацыя і адпачынак. Там знаёмілі курсантаў з сучаснымі танцамі і я тыя танцы адразу пераносіла на свой грунт, навучаючы сваіх падапечных чачы, румбе, рок-н-ролу. Але гэта быў толькі пачатак — падалася я пазнаваць нашы даўнія танцы да Анны Раманюк з Паўлаў, былой настаўніцы, якая раней сама пісала вершы і песні. Запісвала я ад яе песні і крокі, а пасля сама дапрацоўвала з дзецьмі — развучвалі і ставілі мы „Яблычка", „Цёмная ночка", „Выйду на вуліцу", „Кракавяк" колішні, „Пайшоў дзед у поле". Паказвалі мы гэтыя танцы ў Вегнажэве, Варшаве, Вярхлесе, па нашых мясцовасцях...

У нас адбывалася вяселле, на якім я пабачыла Таню Яхімовіч, рэпатрыянтку з Казахстана, якая з сям'ёй пасялілася ў Рыбалах — як яна прыгожа танцавала! І яна стала прыходзіць да нас, паказаць цыганскія і іншыя танцы. Прыйдзе на гадзінку, я тыя цыганскія крокі распішу, вазьму песню. І каб тыя цыганскія танцы станцаваць, мы хадзілі па людзях, збіралі шырокія спадніцы, каралі... Прыехала Валя Ласкевіч, бачыць — ботаў у нашых танцорак няма. Паехала яна з Сычэўскім, афармілі і зараз прывезлі нам балеткі і белыя калготкі. А дзеці рады, у іх душа танцуе! І строі БГКТ зафундавала нам, спадніцы для танцаў заказалі. І заслону для нашай сцэны купілі... З Таняй развучылі яшчэ „Ехаў Ясь на кані" і іншыя танцы. Памагае яна, памагаюць мне і іншыя людзі. Нашы народныя танцы выкарыстоўваю і ў абрадавых сцэнках, што ставім, бо гэта прыдае аўтэнтычнасць.

Добра, што БГКТ арганізуе абрадавыя агляды — гэта трымае нашу традыцыю, захоўвае яе ад забыцця. Два гады таму мы ставілі „Паненскі вечар", у якім выступілі і дзеці ад нулявога класа, і школьнікі, і гімназісты, і кавалеры, і дзеўкі, і дырэктарка былой нашай школы, і я... А яшчэ раней ставілі „Хрысціны", якія памагала нам развучыць Вера Харытанюк з Паўлаў, якой каля сямі дзесяткаў гадоў. І выступіла яна была разам з намі, і „Хлопцы-рыбалоўцы"!..

Апошняй восенню наладзілі мы ў сябе „Пакровы" — гэта Валя Ласкевіч падказала. Гаворыцца ў нас: „Пакрова — дзеўка гатова", бо пасля завяршэння палявых прац можна было ладзіць вяселлі. І Валя склала праграму гэтага абраду, як калісь дзеўку рыхтавалі да вяселля. Два кашы паставілі з дарамі восені, пасярэдзіне хлеб пасвенчаны...

Вельмі добра складваецца ў нас супрацоўніцтва з нашым настаяцелем а. Рыгорам Сасной. Ёлку мы ў царкве ўпрыгожваем, гвязды робім. Калісь Дзям'ян Лукашук з „Рыбалоўцаў" паказаў нашым дзецям як гвязду рабіць; тую гвязду аддалі ў Пасынкі, як там выступалі. І рамантуем гвязды — ці то старыя, ці паднішчаныя. І залатую гвязду ў нашу царкву зрабілі. А я падбіраю дзецям такі рэпертуар, каб і публіка — маладая і старэйшая — магла далучыцца да іхніх калядак.

Зараз у рыбалаўскім доме культуры дзве тэатральныя групы — лялечная і жывога плана — у якіх разам займаецца 12 асоб. У 2007 годзе лялечная група за казку „Эгле" атрымала гран-пры ў арганізаваным БГКТ конкурсе. А другая група ўзяла другое месца за казку „Воўк і ліса". Памагала мне рыхтаваць пастаноўкі Ёля Мордань, як яшчэ ў нас школа была, і дырэктарка памагала.

І да дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова" рыхтуем дзяцей, бярэм усіх ахвотных. На раённым аглядзе сярод наймалодшых 5-гадовая Агатка Максімюк заняла першае месца, у групе 4-6-класнікаў першае месца ўзяла Юстынка Давідзюк, а другое Эвеліна Філіпюк; вылучэнне атрымала Івона Максімюк. А ў цэнтральным аглядзе Агатка атрымала вылучэнне, а Юстына з Эвелінай памяняліся месцамі — усіх жа дэкламатараў было каля ста трыццаці...

І вакалістаў маем, але ў іх ліку толькі адзін хлопчык — Мірэк, брат Юстынкі. У яго вельмі чысты голас, толькі ён крыху нясмелы. Але неяк удалося яго намовіць і ўзяў ён прызавое месца! І дуэт наш другое месца заняў, і Юстынка таксама другое. А годам раней месяц часу рыхтавала нашых спевакоў Ала Каменская: Агатка, Юстынка і Мірэк занялі трэція месцы, а гімназістка Дарота Леснік і хор занялі другія месцы. І ў тэатральным конкурсе нашы акцёры былі ўзнагароджаны, і нашы дэкарацыі палічаны найпрыгажэйшымі.

За поспехі ў конкурсах атрымалі нашы дзеці грашовыя ўзнагароды і за іх наладзілі мы экскурсію ў Аўгустаў. Разам з ранейшымі лаўрэатамі паехала дваццаць дзяцей. Там нашым праваднікам быў наш зямляк Віктар Ігнацюк. Тры гадзіны плавалі мы на судне; былі там таксама старэйшыя людзі, якія нашых дзетак вельмі хвалілі.

І калі я паехала на курсы ў Мінск, то эсэмэскі мне прысылалі, дапытваліся пра мяне.

У Мінску была я тыдзень, у канцы лістапада мінулага года. Курс пад лозунгам „Дакраніся да сваіх каранёў" быў арганізаваны таварыствам „Радзіма"; было 14 курсантаў, большасць з Расіі. Заняткі адбываліся ад світанку да змроку, але не адчувалася стомы. Чыталі лекцыі выдатныя спецыялісты, м.інш. Ніна Кавалёва, Леанід Дранько-Майсюк, Іван Крук, Міхал Дрынеўскі і іншыя. І сам Мінск уразіў мяне чысцінёй, дбайнасцю, прыгажосцю, дынамічнымі ілюмінацыямі...

А тут, у Рыбалах, робіцца тугавата. БГКТ не дастае грошай, няма ўжо сваёй школы, няма настаўніц, усё трэба самой зрабіць; у будынку былой школы мае быць рэгіянальны музей, ужо вядзецца збор экспанатаў... І дзеткі ёсць ад Паўлаў, Стральцоў і Рыбал. У Канюках і Целушках школьных дзяцей ужо няма... Калісь на заняткі прыходзіла ў святліцу нават па сорак дзяцей. Адна з былых вучаніц, цяпер ужо замужняя, сказала спадарыні Лідзіі: „Колькі жыць буду, не забуду, як Вы вучылі мяне танцам..."

Напэўна не ўсё ўдалося мне сабраць тут з таго, што навалам расказала мне Лідзія Мартынюк, але нават і гэта дае ўяўленне пра маштаб працы, якую яна праводзіць у сваёй роднай вёсцы ад дваццаці пяці гадоў. Але найлепш пра гэта даведацца, бываючы на нашых беларускіх мерапрыемствах.

Шчырае дзякуй!

Гэта было ў пятніцу, 18 студзеня г.г. У маю хату ўвайшлі дзве жанчыны. Спачатку я думала, што гэта каляднікі, бо нядаўна былі дзве манашкі з Беларусі, але калі прыгледзелася, дык пазнала Ганну Кандрацюк, а другой асобы я не ведала, але потым аказалася, што гэта Ілона Карпюк.

Я вельмі ўсхвалявалася, бо ў той час на кухні не было яшчэ прыбрана: рыхтавала я посную ежу на Вадзяную каляду. Страву я гатавала на традыцыйнай пліце, якімі мала хто цяпер карыстаецца. Здзівілася я, калі ўбачыла, што яны прывезлі мне шмат цэнных кніжак за ўдзел у XI Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы. Я гэтага не спадзявалася, бо думала, што толькі лаўрэаты атрымаюць такія вялікія ўзнагароды, а ўдзельнікі конкурсу толькі па адной кніжцы, а тут апрача такіх цэнных кніжак яшчэ прыгожы альбом „Нівы", у якім аўтары сабралі вельмі многа цэннага матэрыялу. Шчыра дзякую Праграмнай радзе за апрацаванне такога багатага альбома, у якім змешчаны і мой здымак разам з сяброўкай Вольгай Анацік, якой, на жаль, ужо няма сярод нас.

Вельмі я ўдзячна, што сабралі і апрацавалі даўнія песні, якія адышлі б у нябыт са старэйшымі людзьмі. Маладыя цяпер, не так як калісь, амаль зусім не спяваюць. Даўней моладзь збіралася летам на лаўках, а зімою ў хатах, жартавалі і розныя песні спявалі. Усё мінула, асталіся толькі ўспаміны. Цяпер амаль усе ў хатах сядзяць і ў тэлевізар глядзяць.

Мы з мужам у гэтыя дні аглядалі і чыталі атрыманыя кніжкі. Мой муж Барыс чытае цяпер „Białorusini i stosunki polsko-białoruskie na Białostocczyźnie 1944-1955", а „Ніву" кожную амаль усю прачытае, хаця беларускай мовы ніколі не вучыўся.

Я вельмі перажываю, што на вёсцы бацькі-беларусы са сваімі дзеткамі гавораць на польскай мове. Балюча, што праваслаўныя беларусы стануць палякамі.

З нагоды 50-годдзя „Нівы" ўсім працаўнікам перадаю найлепшыя пажаданні добрага здароўя і поспехаў у працы над развіццём нашай культуры і роднай мовы.

З павагай
Марыя МАНАХОВІЧ

Кошыкі на вуліцы

На вуліцах у Гайнаўцы, як у кожным з гарадоў, стаяць кошыкі для дробнага смецця. Ёсць аднак вуліцы, на якіх іх няма ўвогуле або ёсць адзін кош, так як, напрыклад, па вул. кс. Верабея (тут толькі адзін кош на пачатку вуліцы). Нялёгка знайсці такі кошык па вул. 11 Лістапада і Баторыя. На гэтай апошняй няма г.зв. сметніц ні на адным з аўтобусных прыпынкаў побач мастка. А гэта ж цэнтр горада.

Не ўбачым кошыкаў для смецця па вул. Беластоцкай і Бельскай, Простай і Электрычнай, Дольнай і Паддольнай ды па вул. а. Дзевятоўскага і Спартыўнай.

Не заўважаюць гэтага гарадскія радныя. Ды і гайнавяне, па ўсяму відаць, ставяцца да гэтай справы абыякава.

(ян)

Я не маляваў для грошай!

З Вячкам ЦЕЛЕШАМ, латвійскім класікам экслібрыса, жывапісцам, педагогам рыжскай Акадэміі мастацтваў, збіральнікам і ўкладальнікам культавага выдання „Мінск на старых паштоўках", гаспадаром „Беларускай хаткі" ў Рызе, беларускім грамадскім дзеячам „Сьвітанка", гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.

— Памяць і слава пра „Беларускую хатку" ў Рызе — як у савецкі час называлі Вашу майстэрню — запісаны ў памятнай кнізе. Калі я аглянула яе, у мяне склалася ўражанне, што кожны беларус, які прыязджаў у Латвію, ставіў сабе за гонар наведаць Вашу майстэрню. Тут, між іншым, сустракаем запіскі Уладзіміра Караткевіча, які палічыў Вас чалавекам-з'явай: „Прыйшоў у Краснае Сяло, дзе даўніх шахтаў веле, І аж дыханне заняло, тут з шахтаў вылез Целеш". Побач малюнак Вашай асобы...

— Я сам родам з Краснага Сяла непадалёк Ваўкавыска, дзе знаходзяцца старажытныя шахты. Там яшчэ ў часы неаліту дабывалі крэмень. З Караткевічам пазнаёміўся я ў Юрмале на латвійскім узбярэжжы. Тут быў Дом творчасці, дзе Караткевіч прыязджаў на адпачынак.

— Чарговыя радкі і малюнак велічаюць гасціннасць гаспадара і атмасферу тадышніх сустрэч. Са зместу можна здагадацца, што Ваша сяброўства ўжо замацаванае: „З майстэрні мілай пана Вячкі, паўзлі мы ледзь не на карачках. І дух наш ледзь трымаўся ў целе, калі дамоў пусціў нас Целеш"...

— Гэта такі гумар, таму што Караткевіч ужо не піў, ён сядзеў збоку, складаў гэты вершык, нешта маляваў. Ён быў з жонкай Валяй і паэтам Алегам Лойкам з жонкай. Яны адпачывалі ў Юрмале і наведалі мяне ў Рызе. Я сустрэў іх разам з Сяргеем Панізнікам на вакзале. Спачатку мы павезлі іх у Музей прыроды пад адкрытым небам, потым паехалі ў майстэрню. Па дарозе я купіў бутэлечку лікёру, паставіў каву. Караткевіч намаляваў як жонка паўзе на карачках па прыступках, бо майстэрня была пад дахам, на сёмым паверсе. Ну, гэта такі гумар, таму што ад бутэлькі лікёру мы не былі п'яныя.

— Як Вы пасябравалі з Караткевічам?

— З Караткевічам я пазнаёміўся яшчэ раней, здаецца, у 1977 годзе, у Юрмале, куды завёз мяне Сяргей Панізнік. Я папрасіў, каб ён падпісаў мне сваю кніжку і запрасіў яго да сябе ў Рыгу ў госці. Караткевіч сябраваў з латгальскім паэтам Іеранімам Стопанам. Спачатку, калі ён прыехаў у Рыгу, мы заехалі да Стопана, але яго не было ў хаце і мы паехалі да мяне. Я паказаў Караткевічу старыя паштоўкі з ягонай Оршай. У нас завязаўся кантакт. Калі я прыязджаў у Мінск, сустракаўся з ім, знаёміўся з яго сябрамі. Так я пазнаёміўся з Адамам Мальдзісам ды іншымі паэтамі і пісьменнікамі.

— У памятнай кнізе што крок сустракаем запісы рыцараў беларускага духу.

— Сваю занатоўку пакінулі Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў... Знаёмства з Барадуліным таксама ідзе ад Сяргея Панізніка. У савецкія гады Панізнік быў рэпрэсаваны. Ён часта прыязджаў у Латвію, бо тут жылі яго бацькі і сястра. Ён пазнаёміў мяне з Рыгорам Барадуліным у Мінску, пасля мы сустракаліся ў мяне ў майстэрні.

— Ці ў канцы 1970-1980-х гадоў у Рызе існавала нейкае беларускае кола, аб'яднанне?

***Вячка Целеш** нарадзіўся ў 1938 годзе ў вёсцы Краснае Сяло на Гродзеншчыне. У 1975 г. скончыў педагагічнае аддзяленне Латвійскай акадэміі мастацтваў. Член Саюза мастакоў Беларусі. Першая персанальная выстаўка адбылася ў 1976 г. у Тэрвентэ. Удзельнічаў у амаль сотні калектыўных выставак у Латвіі і замежжы, меў 23 персанальныя выставы. Працуе ў жывапісе, станковай графіцы і экслібрысе. Жыве ў Рызе. Нядаўна ў Партугаліі выйшла энцыклапедыя экслібрыса у якой мастак як адзін прадстаўляе Латвію. На здымку ў энцыклапедыі ён з бел-чырвона-белым значком.*

— Не, гэта мая майстэрня была як таварыства. Пра яе пісалі: „Беларуская хатка Вячкі Целеша". Так, між іншым, пісаў Арлоў. Як гэта ўсё пачалося? Калі я вучыўся ў Акадэміі мастацтваў, часта ездзіў у Мінск, там сустракаўся з патрыятычнай інтэлігенцыяй: мастакамі, навукоўцамі, паэтамі. Яны пасля прыязджалі да мяне ў Рыгу і нават начавалі ў майстэрні. Тут я стварыў багатую беларускую бібліятэку. Пачаў шукаць беларусаў, каб з імі размаўляць на роднай мове, стаў вывучаць беларускую мову...

— Вы з Гродзеншчыны, дык з дому павінны ведаць мову?

— Бацькі размаўлялі, вядома, па-беларуску. Я жыў не ў вёсцы, гэта быў пасёлак Краснасельскі, дзе працаваў агромны цэментавы завод. Побач знаходзіўся аэрадром. Там усякай расійшчыны нагналі. У нас не было беларускай школы, так што я хадзіў у расійскую. Таму я размаўляў па-руску і ўсюды хацеў паказаць, што я гарадскі чалавек... На змену паўплывалі кантакты з беларускімі патрыётамі. Калі мы сустракаліся ў Мінску, яны папракалі мяне: „А што ты такі?" Я тады пачаў разумець чаму латышы ў Акадэміі між сабой ніколі не размаўляюць на чужой мове, толькі па-латышску. Пачаў я шукаць у Рызе беларусаў, каб размаўляць з імі на роднай мове. І да сённяшняга часу я з беларусамі не размаўляю інакш, як толькі па-беларуску.

— І знайшлі Вы беларусаў у Рызе?

— Знайшоў. Тут жыў сябра, мастак з Гомельшчыны, ён добра ведаў мову. Калі мы сустракаліся, размаўлялі выключна па-беларуску. Мы нават паставілі сабе задачу: перфектыўна авалодаем мовай, каб размаўляць лепш за сяброў з Мінска...

— Як Вы апынуліся ў Латвіі? Вы прыехалі сюды за навукай?

— У Краснасельскім (па-нашаму: Краснае Сяло), дзе я нарадзіўся, знаходзіцца цэментавы завод. Я, хоць закончыў сем класаў, у сябе не мог уладкавацца на працу. Спачатку падумаў я стаць слесарам. Каб атрымаць працу слесара ці токара, патрэбна была падрыхтоўка на курсах. Такой магчымасці ў мяне не было. Я працаваў з лапатай у кар'еры чорнарабочым. Пасля мне дазволілі падвучыцца ў цэху, дзе была кузня. Я здаў на разрад, падвучыўся на курсах і ўжо мог працаваць слесарам. Іду да дырэктара, а ён мне кажа: „Няма працы!" А тут, у Рызе, былі такія брыгады слесараў, якія ездзілі па ўсіх цэментавых заводах Латвіі, Лівы, Эстоніі, Ленінграда, у Беларусь. Там уладкаваўся мой аднакласнік, таксама Целеш. Я прыехаў аформіцца ў Рыгу, адтуль мяне накіравалі ў Броцэны, 120 кіламетраў ад сталіцы. Там быў інтэрнат. Мне было 18 гадоў. Разам з брыгадамі ездзіў я ў камандзіроўкі ў Ленінград, Эстонію, Рыгу. Але мне заўсёды хацелася маляваць. Таму я вярнуўся ў Беларусь, на свой завод і нейкі час працаваў мастаком-афарміцелем. Адтуль паехаў паступаць у Мінск у Мастацкае вучылішча. Я не змог паступіць, бо мая падрыхтоўка была слабенькая. У нашым пасёлку не было ні студыі, ні мастакоў. Але я не ведаў яшчэ пра пэўныя механізмы. Праз год я паехаў у Яраслаўль у Расію паступаць у мастацкае вучылішча. Там мяне таксама не прынялі, параілі, каб я падвучыўся з мастаком у студыі. А дзе ў нас падвучышся? У Ваўкавыску быў адзін мастак-самавук, але ён не мог мяне падрыхтаваць. Я зноў паехаў у Рыгу. Падумаў, пасля працы, вечарам буду хадзіць у студыю і рыхтавацца. З Рыгі мяне зноў накіравалі ў тыя Броцэны, але я прасіўся, каб мне далі камандзіроўку на рыжскі завод, каб вечарам хадзіць у студыю. Так зрабілі. У Рызе далі мне месца ў невялічкім інтэрнаце. Тут я працаваў, хадзіў у Мастацкую студыю Дома культуры аўтаработнікаў. Вучыўся пад кірункам Аляксандра Пэтэрсана. Здавалася, усё ідзе як трэба. І тут мяне забіраюць на тры гады ў войска...

— Далёка?

— У Вільню. Там у мяне была вельмі добрая служба. Я праславіўся як мастак на ўсё вучылішча, мяне паказвалі ў тэлебачанні як у вольны час малюю карціны, партрэты салдат, прыроду. Там мне дазволілі хадзіць у грамадзянскую студыю, якая знаходзілася ў Доме культуры чыгуначнікаў. За час службы я закончыў 10-ы вячэрні клас і збіраўся паступаць у Віленскі мастацкі інстытут. Літоўцы патрабавалі нацыянальныя кадры і параілі мне з'ездзіць у Беларусь. Я звольніўся з войска

працяг ☞12

Больш хвалююць чэчэнцы, чым беларусы

Размова з Агнешкай Голанд.
(працяг з „Нівы" н-р 4)

— ***Ці можа існаваць народ без уласнай мовы, які тае мовы адракаецца па ўласнай волі?***

— Можа. Маем такія выпадкі, таксама ў гэтай частцы г.зв. Заходняй Еўропы, хоць бы з ірландцамі, якія афіцыйна гавораць на мове акупантаў, значыць, па-англійску, а якая моцная ў іх нацыянальная тоеснасць. Мала хто там гаворыць па-кельцку, стараірландскай гаворкай. Швейцарцы, якія лічаць сябе адным народам, не маюць адной супольнай мовы. У Бельгіі даходзіць да крызісу таксама па той прычыне, што ў гэтай супольнасці няма супольнай мовы.

— ***Калі не мова, то што з'яўляецца прыкметай народа?***

— Гэта рухомае, расплыўное паняцце. У Польшчы, па нацыяналістычных прычынах, яно вельмі істотнае і накіраванае ў мінулае, у гісторыю. Гэта таямніца, адкуль бярэцца ў людзях пачуццё нацыянальнай прыналежнасці, пачуццё нацыянальнай тоеснасці, самавызначэння. Нядаўна хтосьці мне сказаў, што дзеці, народжаныя з прабіркі, шляхам штучнага апладнення, у паніцы шукаюць сваіх натуральных бацькоў, уласнікаў спермы. Тут аказалася, што людзі хочуць ведаць, адкуль яны і каму яны належаць. Глабалістычныя плыні, аб якіх я гаварыла, парадаксальна, замест паслабіць гэтую тэндэнцыю, моцную патрэбу самавызначэння тоеснасці, хутчэй яе ўзмацняюць. У гэтым глабалізаваным свеце людзі пачалі баяцца ананімнасці, уніфармізацыі, хочуць адзначыць нейкім чынам сваю адметнасць, выключнасць, індывідуальнасць. Мабыць, гэта адна з прычын таго, што народы, незалежна ад уласных, рацыянальных інтарэсаў, хочуць так вызначацца, змагаюцца за гэта. Былая Югаславія з'яўляецца гэтаму найлепшым прыкладам. Парадаксальна, пасля правалу камунізму здавалася б, што большасць гэтых краін магла б імкнуцца ў задзіночаную Еўропу; замест штораз больш яднацца, Югаславія распалася і мова тут не была крытэрыем. Хоць яны заяўляюць, што сербская, баснійская, харвацкая мовы прынцыпова адрозніваюцца адна ад адной, аднак гэта бязглуздзіца. Гэтая мова дэ-факта такая самая, з малымі мясцовымі адрозненнямі, меншымі чым паміж Сілезіяй і цэнтральнай Польшчай.

— ***Успамінаеце аб паняцці глабалізацыі. Скажыце, калі ласка, якія найбольшыя пасткі падпільноўваюць глабалізаваных еўрапейцаў.***

— Сама глабалізацыя не з'яўляецца еўрапейцам найбольшай пасткай. З'яўляецца ёю страта энергіі, волі змагання і развіцця. Еўрапейцам пагражае хутчэй тое, што яны хочуць, каб жылося ім як найлепш і найбольш выгадна, і ў сувязі з гэтым будуць траціць матывіроўку, каб размнажацца. Вядзецца гаворка аб эміграцыі, аб ісламе, які апаноўвае Еўропу. І штосьці ў гэтым ёсць, беручы пад увагу няўмеласць адаптацыі і сужыцця розных культур у еўрапейскіх краінах. У Злучаных Штатах розныя этнічныя, рэлігійныя, моўныя групы неяк у гэтым тыгелі дапасоўваюцца адны да адных пры захоўванні ўласных своеасаблівасцей, адначасна адчуваючы сябе грамадзянамі ЗША, з моцным пачуццём патрыятызму і супольнасці. Значыць, Злучаныя Штаты Паўночнай Амерыкі з'яўляюцца прыкладам таго, што такое суіснаванне магчымае. Еўропе здаецца, што ген дынамічнага памнажання свайго жыцця заатакаваны. Не таму, што эмігранты з'яўляюцца пагрозай, што так фактычна і ёсць, а таму, што можа аказацца, што якраз толькі яны адзіныя тут размнажаюцца. І гэта найбольшая небяспека, якая стаіць перад Еўропай.

— ***Значыць, што бяда дазваляе перапрываць народам, грамадствам?***

— На тое і выглядае.

— ***Таксама беларуская бяда можа памагчы гэтаму народу прытрымацца?***

— Няма ў мяне ведаў, які натуральны прырост у Беларусі. Ведаю, што, напрыклад, у Расіі ён выражаецца адмоўным лікам, значыць, больш людзей там памірае, чым нараджаецца. Можа, гэта справа не бяды, а больш нейкай формы надзеі, энергіі, нейкага гена, які спрычыняецца да таго, што ёсць матывіроўка, каб працягваць папуляцыю.

— ***Ну, але і ў Польшчы гаворыцца, што з кожным годам усё лепш, людзі жывуць усё больш заможна, а натуральны прырост узрастае. Дык як гэта з той найбольшай пасткай Еўропы?***

— У Францыі ці Швецыі, напрыклад, таксама ён узрастае. Гэта не так проста растлумачыць. Беручы генеральна, неяк ад дваццаці гадоў паніжаецца працэнт агульнага ліку карэнных еўрапейцаў.

— ***Дык, мяркую, на гэтую праблему трэба глядзець у катэгорыях пакаленняў?***

— Ага. Хоць я задумваюся, ці гэта дрэнна, што праз нейкія восемдзесят гадоў Еўропа стане арабскай, афрыканскай. У гісторыі Еўропы такія працэсы адбываліся безупынна; мы галоўным чынам патомкі азіятаў.

— ***Вярнуся да пытанняў звязаных непасрэдна з Беларуссю. У адным з адрэзкаў серыяла «Экіпа», якога рэжысёрамі з'яўляецеся Вы, Ваша сястра Магдалена Лазаркевіч і дачка Кацярына Адамік, галоўны герой, прэм'ер Турскі, перадае паслу Беларусі ў Польшчы ультыматум у сувязі са спробай ядзерных тэстаў у Беларусі, праведзеных расіянамі: «Варшава заступіцца за Мінск, калі ён будзе хадайнічаць за выдаленне расійскіх ваенных». Ці такі метад дыялогу адпаведны ў рэальным свеце ў адносінах да расійскіх палітыкаў?***

— Вы кажаце пра адцягванне Беларусі ад Расіі?

— ***Між іншым. Але і пра гэты від шантажу.***

— Гэта шантаж, але і спосаб, каб маніфеставаць беларусам, што яны падобныя на нас, што ў нас супольныя інтарэсы. Гэта адзін з метадаў вельмі цяжкага вядзення дыялогу з дыктатурай, якая ў нейкім сэнсе з'яўляецца дэлегатурай вялікай расійскай імперыі. Дазволены ўсе прыёмы і сродкі. Можа аказацца, што такія неканвенцыянальныя метады — паспяховыя і размякчаючыя. На падобных прынцыпах Захад гуляў з савецкай Расіяй. Генеральна, вядома, прайграваў, ды час ад часу ўдавалася штосьці дасягнуць. Былі такія гульні з правадырамі камуністычных «дэмалюдаў». Захад здабываў нейкія вынікі. Напрыклад, праз тое, як ставіўся да Герка ці пасля Ярузельскага, што раздражняла апазіцыю. Было гэта паспяховае, бо, можа, ментальна давяло таксама да Круглага стала. Пры вялікіх дыктатурах, як Адольфа Гітлера, які хацеў знішчыць усё што ненямецкае, такія метады, вядома, абсурдныя. Пры «мяккіх» дыктатурах, дзе маецца тоесная амбівалентнасць, можна штосьці выйграць; дзесьці там ёсць у іх той элемент нацыянальнай тоеснасці. Мы з членамі Аддзела культуры ЦК ПАРП гулялі такім шантажом пад лозунгам польскай культуры і тым адзначваннем, што мы — палякі, а іхнія метады — антынацыянальныя. На большасць з іх гэта ўздзейнічала. Думаю, што метад размякчання на ўзроўні найвышэйшых улад не трэба адкідваць.

— ***Тадэвуш Ламніцкі таксама казаў, што з'яўляецца членам ЦК ПАРП таму, каб размякчыць і захоўваць найвышэйшыя, не заўсёды адабральныя тагачаснымі ўладамі, каштоўнасці.***

— З Тадэвушам Ламніцкім справа больш складаная. Гэта быў геніяльны акцёр і вельмі Тадэвуша я любіла, але была ў ім моцная патрэба ўлады, што выяўлялася таксама і на сцэне. Каб выконваць такую прафесію як ён, не трэба было плаціць такіх палітычных сервітутаў. Чым іншым з'яўляецца размякчанне рэжыму суседняй краіны, а чым іншым — апрананне па кан'юнктурных прычынах убрання Конрада Валенрода. Так, дарэчы, у дуалізм польскіх паводзін, польскай душы і можа не толькі польскай, упісваецца вобраз чалавека, які з аднаго боку апынуўся ў лагеры прыгнятальнікаў, а з другога — з'яўляецца змагаром за свабоду.

— ***І, амаль на канец. Беларусь Еўропе патрэбная?***

— Кожная частка Еўропы ёй патрэбная, таксама Беларусь, хоць бы як той памост паміж Еўропай і Расіяй, у геаграфічным сэнсе. Я сама ведаю пра Беларусь страшэнна мала. Мне проста сорамна. Больш-менш ведаю, на што абапіраецца яе мова, больш-менш ведаю яе гісторыю, ведаю пару літаратурных прозвішчаў.

— ***У мяне такое ўражанне, што гэтак званых еўрапейцаў Беларусь мала цікавіць.***

— Ведаеце, мяне, напрыклад, мала таксама цікавіць Балгарыя. Чалавек не адчувае безупыннай салідарнасці з усімі нацыянальнымі формамі Еўропы ці Азіі. Аднак, калі сустрэнуся з патрэбай беларусаў, якія звернуцца да мяне за дапамогай, ахвотна гэта зраблю. Ды гэтая краіна не пабуджвае майго ўяўлення настолькі, каб я сама шукала нейкіх шляхоў да іх. Больш хвалююць маё ўяўленне, напрыклад, чэчэнцы, чым беларусы. Можа гэта гучыць непрыемна, але ў Еўропе, здаецца, адчуванне падобнае. І гэта не зменіцца. Пакуль беларусы самі не пачнуць змагацца за сваё месца на зямлі.

— ***Дзякую за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Да 400-годдзя смерці Канстанціна Астрожскага

Чарговы нумар багаслоўска-літаратурна-мастацкага лістка „Жыровіцкая абіцель", які рэдагуе інак Мікалай (паэт Зьніч), пабачыў свет напярэдадні Вадохрышча ў Жыровічах.

Увесь нумар лістка прысвечаны князю Канстанціну (Васілю) Астрожскаму, якому спаўняецца 400 гадоў з дня ягонай смерці.

Канстанцін Астрожскі ў нашай гісторыі пакінуў слаўны след. Ён быў найвышэйшым гетманам Вялікага княства Літоўскага, віленскім кашталянам і троцкім ваяводам. Дзякуючы багацтву (яму належала 25 гарадоў, 10 мястэчак і 670 вёсак), быў адным з уплывовых магнатаў Вялікага княства Літоўскага. Выступаў супраць пашырэння каталіцтва на Беларусі і Украіне. Пра сваю нязгоду з афіцыйнай палітыкай Рэчы Паспалітай ён неаднойчы заяўляў на сейме Польска-Літоўскай дзяржавы, звяртаўся з пасланнямі да караля, жыхароў Рэчы Паспалітай, да праваслаўных епіскапаў. Ён быў арганізатарам і актыўным удзельнікам праваслаўнага сабора 1596 года, які праходзіў у Брэсце адначасова з уніяцкім пад кіраўніцтвам свяшчэннамучаніка Нікіфара Кантакузіна — пасланніка канстанцінопальскага патрыярха. Пасля падпісання уніі князь працягваў нялёгкую барацьбу ў абарону правоў і годнасці праваслаўных.

Канстанцін Астрожскі быў фундатарам пабудовы мураванага сабора ў Навагрудку, царквы ў гонар святціцеля Мікалая ў Вільні, храмаў у Смалявічах, Дзятлаве ды іншых гарадах і мястэчках. Князь падтрымліваў праваслаўныя брацтвы, заснаваў школы ў Слуцку, Тураве, Астрожскую друкарню і г.д.

Заслугі Канстанціна Астрожскага і сёння ўшаноўваюцца ўдзячнымі нашчадкамі. У Мінску ў Свята-Паўлаўскім саборы штогод 26 лютага адпраўляецца паніхіда і праводзяцца Астрожскія царкоўна-асветніцкія чытанні. У Беластоку заснаваны фонд імя князя Астрожскага. За значны ўклад у справу нацыянальнага і духоўнага адраджэння медалём і ганаровай прэміяй імя Канстанціна Астрожскага штогод узнагароджваюцца рупліўцы на ніве праваслаўнага асветніцтва. Дарэчы, сёлета плануецца шырока адзначыць 400-годдзе памяці славутага асветніка не толькі ў Беларусі, але ў Польшчы, Расіі, Літве і на Украіне.

Лісток „Жыровіцкая абіцель" распавядае пра радавод Астрожскіх, пра служэнне Богу і Бацькаўшчыне, пра Астрожскую акадэмію і біблію, а таксама пра памяць нашчадкаў. Матэрыял пра славутага князя падрыхтавала Лідзія Кулажанка.

Лісток таксама друкуе верш Зьніча „Грунвальд духоўны". Наклад выдання — 10 тысяч асобнікаў. Выходзіць лісток у Жыровічах з 1997 года.

Сяргей ЧЫГРЫН

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Адкуль узяўся Асёл у бэтлеемскай гісторыі?

Аўтар „Шляху да Бэтлеему": Сяргей Кавалёў

Сцэнічная рэдакцыя і пастаноўка: Алег Жугжда

Сцэнаграфія і лялькі: Ларыса Мікіна-Прабадзяк

Музыка: Паўл Кандрусевіч

Акцёры: Іван Добрук, Васіль Прабадзяк, Ларыса Мікуліч, Галіна Закрэўская.

„Шлях да Бэтлеему" — гэта гісторыя Асла, які падаецца ў свет, каб сустрэць Бога, які пераменіць яго ў Зорку. Дзеля кампаніі Асёл хоча забраць з сабой у падарожжа найлепшага сябру — Парсюка. Аднак, Парсюк не ў змозе адарвацца ад карыта, ён сумняваецца ў паспяховасці вандроўкі прыяцеля. Далей Асёл сустракае Льва, гэты ў сваю чаргу верыць толькі ў сілу, якая дае ўладу над светам. Пад уплывам караля звяроў Асёл пачынае сумнявацца ў слушнасць свайго шляху. З дапамогай прыходзіць яму выпадак. На вачах людзі застрэляць магутнага Льва. На сваёй дарозе Асёл сустрэне яшчэ сляпога Крата ды Малпу, якая выдае сябе за Бога. Блюзнерствы Малпы маюць адну мэту — ёй хочацца вырвацца з клеткі!

Сама сустрэча ў Бэтлееме з нованароджаным Богам — нечаканая для Асла. Ён не адводзіць ёй асаблівай увагі. Асёл здзіўлены, што яго мара здзяйсняецца, зараз ён, як зорка, можа патрапіць на неба. Тут, аднак, узнікае маральная праблема. Прыняць светлы дар не дазваляюць абставіны — дзіцятку пагражае небяспека. Асёл прапануе сваю спіну, на якой Нованароджаны зможа ўцячы ад мяча Ірада ў Егіпет...

П'еса апавядае пра адвечныя справы дабра і зла. Глядач разумее, што найважнейшае ў жыцці не дабрабыт, сіла ці слава, а звычайная дабрыня. У гэтым выпадку дорыць нам яе пагарджаны людзьмі Асёл. Глядач урэшце разумее адкуль у бэтлеемскай гісторыі з'явіўся Асёл!

У спектаклі выкарыстаны беларускія калядкі. Калі ідзе пра ігру акцёраў, дык можна сказаць адно — гродзенцы паказалі чыстае майстэрства! Яны захапілі публіку, якая не шкадавала ім апладысментаў.

— Якія ўражлівыя і разумныя ў вас маладыя людзі, — сказала ўжо пасля спектакля намеснік дырэктара Гродзенскага лялечнага тэатра. — І як цудоўна разумеюць беларускую мову! А ў нас, калі прапануем спектакль на беларускай мове, мала дзе запрашаюць. Калі ласка, кажуць, іграйце па-руску, тады прыйдзем...

Словы захаплення былі выказаны ў бок гайнаўскіх гімназістаў і ліцэістаў з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Раз, што запоўнілі яны аграмадную залу Гайнаўскага дома культуры, жыва ўспрымалі кожны фрагмент пастаноўкі, а на канец адплаціліся бурнымі воплескамі. Здавалася, лопнуць сцены...

Гродзенскі лялечны тэатр вядомы ў Беларусі і ў замежжы. Яго прыезд на Беласточчыну можна лічыць калядным падарункам нашым дзецям і моладзі, якім неабыякавае беларускае слова. Цягам трох дзён — з 16 па 18 студзеня г.г. „Шлях да Бэтлеему" пабачылі тэатралы Беластока, Гарадка і Гайнаўкі. Гастролі былі арганізаваны консулам РБ у Беластоку Міхалам Аляксейчыкам.

ЗОРКА

Адкуль узялася мышка Пік-Пік

— Мышка нарадзілася ў Мінску, у мураваным шматпавярховым доме па вуліцы Волаха, недалёка ад хаты, дзе жыў вялікі сябра ўсіх дзяцей, таксама і „зорчыных", дзед паэт Сяргей Новік-Пяюн, — памятае пра гэта Цёця Міра. — Можа, ведалі яе яшчэ раней і Валянціна Коўтун, і Васіль Зуёнак, пісьменнікі, якія раней жылі ў гэтай кватэры. Ды, мабыць, не кожнаму яна паказвалася. Трэба было толькі яе рассакрэціць. А выйшла мышка са свайго схову, калі пасялілася тут сям'я Шніпаў-Рублеўскіх. І стала расказваць баі пра ўвішную кватарантку мама Людміла вечарамі дачушцы Веранічцы. Прыехала з Беластока ў госці Цёця Міра, і яна ўбаюкалася ў салодкі сон пад цікавыя гісторыі пра мышку Пік-Пік. „Запішы іх для нашых, „зорчыных" дзетак, хай таксама пацешацца!" — прыстала Цёця Міра да мамы Людмілы. „А я прозы не пішу, я пішу толькі вершы!" — баранілася вядомая паэтэса, ды аддрукавала на машынцы некалькі першых апавяданняў. Паявіліся яны ў „Зорцы", у 36 нумары за 1991 год і друкаваліся ўсе аж да 1995 года. Сталі пачаткам знакамітай прозы Людмілы Рублеўскай. І вялікай радасцю першачытачам калыханак пра мышку Пік-Пік, цяпер знаёмую і маленькіх, і вялікіх беларусаў. Бо прыгоды мышкі Пік-Пік паявіліся ў новым прыгожым выданні ў Беластоку, выдадзеныя асацыяцыяй АБ-БА — згуртаваннем бацькоў дзяцей, вывучаючых беларускую мову.

Тады маленькая Веранічка цяпер вучыцца на мастачку, — яна і аздобіла цяпер кніжачку сваімі каляровымі малюнкамі. А тады, калі друкаваліся першыя прыгоды мышкі Пік-Пік у „Зорцы", мышчыны сябры з Беласточчыны прысылалі ў „Зорку" свае ўявы, як выглядзе самая цікавая беларуская мышка, як жыве і якія прыгоды перажывае ў сваім маленькім жыцці. Цяпер тыя аўтары — цалкам дарослыя! А якая ў вас уява пра мышку Пік-Пік? Ці падобная яна, як у Веранічкі, ці зусім іншая?

На здымку — дзецям з Беластока мышка Пік-Пік у новым выданні трапіла першая ў рукі.

Міра ЛУКША

„Святая Зямля” ў Орлі

У Комплексе школ у Орлі працуе фотавыстаўка пад загалоўкам „Святая Зямля”. Вучні нашай школы маюць магчымасць паглядзець здымкі Іерусаліма. Аўтары фатаграфій — Славамір Астапчук, Ежы Астапчук, Ігар Іванові Каладзін, Марыя Юрчук ды Людміла і Марк Якімюкі. На адкрыццё выстаўкі ў нашу школу прыехаў этна-гурт „Жэмэрва” з Бельска-Падляшскага. А сярод гасцей, якія ўдастоілі мерапрыемства, былі працаўнікі гміны: сакратар Ірэна Адзіевіч, старшыня Рады гміны Аляксандр Клін, кіраўнік ГАК Анна Несцярук, старшыня Рады бацькоў Міраслаў Бало, святары а. Анатоль Такаюк, а. Іаан Сцепанюк, а. Аляксандр Такарэўскі, настаўнікі-пенсіянеры і жыхары Арлянскай гміны.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Аўтаркі на фоне выстаўкі

У час мерапрыемства выступілі лаўрэаты каляднага конкурсу. Бацюшка Анатоль Такаюк расказаў нам пра Святую Зямлю. Выстаўка захапіла прыгажосцю і тэматычнай разнавіднасцю. Мы маглі пабачыць як выглядае Гасподняя магіла, тамтэйшыя цэрквы, вопратка людзей, прырода...

Выстаўку падрыхтаваў Дзмітры Мартыновіч. Урачыстае адкрыццё выстаўкі адбылося 17 студзеня 2008 г.

Юстына Дзядуля
і Івона БАРШЧЭЎСКАЯ
Гімназія ў Орлі

ГІСТОРЫЯ ПРА ТРЫ РАМОНКІ

Жылі на свеце тры дзяўчынкі. Тры дзяўчынкі-гаравінкі. Але часцей не гаравалі, а ўсё гадалі. То на свечках, то на ніках-сардэчках, а болей на рамонках. На тых самых рамонках, што растуць паўсюль, але іншым разам якіх так не хапае! Асабліва, калі сыходзяцца разам тыя самыя тры дзяўчынкі.

Вось і ў той дзень яны як сышліся, як распачалі сваё гаданне-мудраванне, дык навокал гэтых беленькіх звонкіх кветачак ніводнай і не засталося. А застаўся толькі адзін рамоначак. І толькі на адзінага хлопчыка ірвалі пялёсткі іхнія нецярплівыя ручкі. Ірвалі так, што ўвесь і абарвалі... Але, абарваўшы, так і не дазналіся каго ж з іх трох хлопчык гэты абярэ назаўсёды.

А ён, пакуль абіраць і не думаючы, проста з'явіўся побач, проста падараваў ім усім траім па адзіным, прыгожым, залатым рамонку. І дзве дзеўчынёхі ну проста аж запішчэлі ад задавальнення і адразу ўхапіліся за пялёсткі сваімі танклявымі пальчыкамі.

А трэцяя... А трэцяя не змагла, не здолела асыпаць гэткую прыгажосць, гэткую белапеннасць, гэтае пачуццёвае дараванне. Дараванне ад таго, хто... На каго і гадаць не выпадала! Каго вельмі хацелася проста бачыць, і хто сам усё тое адчуў.

І быў у той дзень толькі адзіны рамонак.

Але быў яшчэ адзін дзень, і яшчэ, і яшчэ... І кожны дзень дабаўляў яшчэ адну кветку. Пакуль тых кветак не стала столькі, колькі пялёсткаў у кожным рамонку, і колькі рамонкаў у кожным букеце, якія дорыць і па сённяшні дзень закаханы хлопчык сваёй дзяўчынцы, залацістай, як той першы рамонак.

Ваш Дзядзечка Сід

17 кастрычніка 2007 г., Кобрын

Музыка з кайфам

„Свой чалавек” — Віктар Шалкевіч

Найчасцей запрашаю вас на сустрэчы з гуртамі, якія, нягледзячы на працягласць свайго існавання, у нейкі спосаб складаюць гісторыю сучаснай, беларускай музыкі, не толькі маладзёвай. Вяртаемся да крыніц, заглядаем часам на іх панадворак, а сёння прагуляемся па вулічках старадаўняга Гродна, бо там не толькі паўставала беларуская гісторыя, але між іншым свае вытокі ў пэўным энсе маюць беларускія фестывалі на Падляшшы. А вытокі называюцца Віктар Шалкевіч. Падумала я сабе, што не толькі рок-каманды важныя, часта гісторыю складаюць адзінкі!

Напэўна ніхто з вас не помніць пачаткаў фестывалю „Басовішча”, але калі вашы бацькі пабывалі тады ў гарадоцкім Барыку, напэўна ўспамінаюць, калі пад драўлянай пляцоўкай — як яе ўсе называюць — выступалі пераважна барды з гітарамі, сярод якіх было таксама месца для Віктара Шалкевіча. Тады яшчэ ніхто не думаў пра „Бардаўскую восень”, але наш гродзенскі бард ужо пачаў упісвацца ў рамкі сапраўднага гродзенска-падляшскага сяброўства.

Віктар Шалкевіч асацыюецца перад усім з гітарай, як амаль кожны бард, але дадатковай рысай гэтага выканаўцы з'яўляецца неверагоднае пачуццё гумару. Калі глядзіш на яго, здаецца, у яго проста няма турбот, хаця добра ведаем, што бесклапотных людзей са свечкай удзень шукаць! На дадатак — ён лысы, з характэрным гарбатым носам і вялікімі вачыма (спадзяюся, не абразіцца на мяне), тады проста можна ім палохаць малых дзяцей. Але якраз выгляд ды голас ён выкарыстоўвае ў сваім чарговым занятку — штодзень працуе ён акцёрам у Гродзенскім лялечным тэатры. Тыя, якія яго бачылі, проста захапляюцца талентам, ігрою, умеласцямі, бо, здаецца, ён створаны для гэтага, а сваімі каранямі проста ўрастае ў сцэну.

Але на канец вяртаюся яшчэ да музыкі. Варта паслухаць ягоных песень хаця б таму, што бард у лёгкі, часта вельмі іранічны спосаб, распавядае ў сваіх песнях пра лакальную гісторыю, пра здарэнні былыя і небылыя на Гродзеншчыне, а таксама і ў нас. Часам толькі з гітарай, іншым разам у суправаджэнні іншых інструментаў (варта дадаць, што ён таксама элегантна аранжыруе песні да танца) можна ад яго пачуць пра Гайнаўку, Бельск ці Беласток і адчуваецца, што Шалкевіч проста „свой чалавек”!

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Колькі гадкоў табе дзетка?

— Бачымся мы вельмі рэдка.
Колькі гадкоў табе, дзетка?
— Нямнога яшчэ пражылося,
Гадочкаў мне толькі восем.

Гады так мінаюць паволі,
Пачаў здабываць веды ў школе.
Гадкоў больш было б, зразумела,
Каб татка мой быў больш смелы.

У заапарку

Быў у заапарку
З рознымі звярамі,
Сыночак Макарка
Са сваёю мамай.

— Гэта асёл, сынку,
Родам з каняватых.
— Няма ж напамінку
У ім з нашым татам.

Польска-беларуская крыжаванка № 5



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 1: Этап, мастак, ты, горка, зорка, гліна, рэпа, рама, абрад, кара, аса, Тыгр, тры, лак, зіма, гонар, мора, парк, скарб, эта, эра, пас, Канада.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі**, выйгралі: **Януш Зюзя, Моніка Данілюк, Магда Куптэль, Кася Грыгарук, Адам Сцепанюк** з Гайнаўкі, **Кацярына Саковіч, Дыяна Свірыдзюк, Анна Капытка, Эвеліна Артэмюк** з Чыжоў, **Крыстына Баршчэўская** з Орлі. Віншуем!

Гісторыя звярынецкага помніка зубру

Пётр БАЙКО

Турысты, якія едуць шашой з Гайнаўкі ў Белавежу, у палове дарогі мінаюць, на левым баку, пасяленне Звярынец. Перад ім стаіць помнік зубру. Экскурсаводы прыгадваюць турыстам, што тут нарадзіліся пісьменнік Ігар Нэверлі і паэт Ежы Ясінскі, што напрыканцы XIX стагоддзя пасяленне наведвалі вядомыя літаратары, мастакі і вучоныя, напрыклад, Эліза Ажэшка, Генрык Сянкевіч, Вацлаў Серашэўскі, Зыгмунт Глогер, Баляслаў Лашчынскі — усе яны, пасля свайго тут знаходжання аставілі след ва ўласных творах. Звярынец, аднак, найбольш славіцца помнікам зубру, які быў тут пастаўлены ў 1862 годзе і вывезены ў 1915 годзе ў Расію, адкуль пасля заканчэння вайны вярнуўся ў Польшчу — пачаткова ў Варшаву, а потым у Спалу. Помнік, які зараз стаіць у Звярынцы, зусім новы, але...

Помнік зубру ў Звярынцы выстаўлены ў 1862 годзе.

Пачну ад самага пачатку. Гісторыя пасялення Звярынец у Белавежскай пушчы пачынаецца з пачатку другой паловы XIX стагоддзя, калі на месцы колішняга „агарода для палявання", называнага „Тэрэміска", збудаваны быў вялікі звярынец. Непасрэднай прычынай яго збудавання было прадказванае царом Аляксандрам II паляванне на 1860 год. У агароджы памешчана звыш 300 штук усялякай звярыны — зуброў, ласёў, аленяў, рабых аленяў (даніеляў), сарнаў, дзікоў, ваўкоў, лісоў, барсукоў і зайцоў. Пачаткова плошча звярынца налічвала каля 600 гектараў, але ўжо пад канец 60-х гадоў XIX стагоддзя ўзрасла пад 800 гектараў. Напрыканцы стагоддзя тэрыторыя гэтая займала плошчу звыш 900 гектараў.

Падчас будовы звярынца, побач яго, заснавана невялікае пасяленне. Састаўлялі яе дом наглядчыка, гумно, абора і свіран. У 1891 годзе старэйшы ляснічы Ганс Аўэр на месцы старой сядзібы наглядчыка збудаваў новы, пышны двухпавярховы паляўнічы павільён, часта называны палацыкам. Збудаваны быў таксама новы дом для наглядчыка зуброў. Пасля I сусветнай вайны, у 1929 годзе, у палацыку змяшчалася сядзіба Надляснічства Звярынец. Аб'ект гэты згарэў 17 красавіка 1935 года. На яго месцы, яшчэ да II сусветнай вайны, узведзена была новая будыніна, але ўжо нашмат скрамнейшая, мізэрнага выгляду. У 1955 годзе, пасля стварэння Асяродка рэдкай звярыны (замененага потым на Асяродак зубрагадоўлі) у Звярынцы размясцілася яго сядзіба. Пасяленне займае зараз паверхню 15 гектараў.

Паляванне цара Аляксандра II адбылося 6-7 кастрычніка 1860 года. Запісалася яно ў гісторыі як першае царскае паляванне ў Белавежскай пушчы. Застрэлена тады 96 большых штук, з якіх на цара выпала 10 зуброў, 8 сарнаў, 5 ваўкоў, 5 лісоў, а таксама па адным дзіку і барсуку. У 1862 годзе, на памятку аб гэтым здарэнні, перад пасяленнем Звярынец на пастаменце пастаўлена была чыгунная адліўка зубра натуральнай велічыні. Адліўка была выканана на пецярбургскай фабрыцы Агарова паводле праекта прыдворнага мастака Міхала Зічы. На абочынах пастамента пададзены кароткія звесткі аб паляванні: калі яно адбылося, прозвішчы больш важных удзельнікаў і колькасць упаляванай звярыны.

У той сам час было выкананых больш за дзесятак мініяцюрных копій помніка зубру з серабра і бронзы. Адну з гэтых фігурак зараз экспануе музей Белавежскай пушчы ў Каменюках на Беларусі. Паасобныя экземпляры фігурак можна сустрэць у некалькіх іншых музеях на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, а таксама ў прыватных калекцыях (м.інш. у калекцыі вядомага расійскага заолога, даследчыка зубра праф. А. С. Немцава).

Белавежскі помнік трапіў на вокладку кніжкі А. Валковіча „Зубр беловежский чугунный" (2007).

Помнік зубру ў Звярынцы больш за паўстагоддзя быў атракцыёнам для ўсіх наведваючых Белавежскую пушчу. Нярэдка ён увекавечваўся на плёнцы, таксама малявалі яго мастакі. Аж прыйшоў жнівень 1915 года, калі і ў пушчу дабралася рэха сусветнай вайны. Рускія, пакідаючыя гэтую тэрыторыю, у ліку эвакуіраваных у Расію гістарычных памятак вывезлі і помнік зубру. Момант, калі помнік здымалі з пастамента, увекавечыў нейкі фатограф — здымак гэты быў потым змешчаны ў польскім часопісе „Kurier Literacko-Naukowy" — дадатку да „Ilustrowanego Kuryera Codziennego" н-р 97 ад 14 красавіка 1930 года.

У 1924 годзе, у выніку рэвіндыкацыі помнікаў старадаўнасці, адліўка зубра была вернута Расіяй Польшчы. Помнік трапіў на панадворак Каралеўскага замка ў Варшаве, затым на нядоўгі перыяд завітаў у Музей зямлі, адкуль у 1928 годзе, на падставе рашэння прэзідэнта Рэчы Паспалітай Ігнацы Масціцкага, быў перавезены ў яго летнюю рэзідэнцыю ў Спале. Тут жа і стаіць ён па сённяшні дзень. За ўвесь гэты час стаў ён нават сімвалам мясцовасці.

У 1959 годзе пастамент у Звярынцы, на якім стаяў помнік зубру, разабралі. Зноў здабыты матэрыял прызначылі на будову помніка памардаваным каля царквы ў Белавежы. Паяўляючыеся зрэдку нясмелыя галасы белавежцаў, каб вярнуць ім помнік, старалася падтрымліваць прэса. У другой палове семідзесятых гадоў артыкулы на гэтую тэму друкаваліся м.інш. у штодзённых „Słowo Powszechne" і „Gazeta Białostocka".

У 1981 годзе ў Белавежы заснавалася грамадская камісія, якая паставіла перад сабой мэту давесці да звароту сваёй гістарычнай памяткі. Камісію ўзначаліў настаўнік Ян Казак. Камісія з'ездзіла ў Спалу, выканала фатаграфічную дакументацыю, парабіла архіўныя выпіскі, затым паслала пісьмо ў Гмінную народную раду ў Інавлодзу з патрабаваннем вярнуць помнік. Як можна было спадзявацца, гаспадары гміны на гэта не згадзіліся. Пачалася тады падрыхтоўка чарговага пісьма, на гэты раз у Ваяводскую народную раду, але якраз у Польшчы ўведзена было ваеннае становішча і ўся справа ўпала. Прабавалі да яе вярнуцца вясной 1983 года, але ўжо без ранейшага энтузіязму. Тым часам у Спале заснаваўся... Грамадскі камітэт абароны спальскага (!) зубра, які ўзначаліў мгр інж. Лехаслаў Зуберт. Камітэт распачаў шырока намечаную кампанію па зберажэнню помніка перад высяленнем у Белавежу, а патрабаванні белавежцаў палічыў „скандалам" і „беспрэцэдэнтнай рэвіндыкацыяй".

Белавежскі зубр на „ссылцы" ў Спале.

Справай звароту помніка старалася пакарыстацца, у рамках перадвыбарчых кампаній, некалькіх кандыдатаў у радных або паслоў, абяцаючы вярнуць гістарычную памятку пасля выйгрышу на выбарах. На жаль, гэтыя абяцанні аказваліся звычайнай „перадвыбарчай кілбасай". Зрэшты, ніхто і так ім не верыў.

У жніўні 1999 года ў Звярынцы ўстаноўлена была дошка, на якой на польскай і англійскай мовах запісана гісторыя адсутнага тут помніка.

Размова наконт звароту Белавежы чыгуннага зубра нечакана адбылася падчас прэзідэнцкіх дажынак у Спале ў 2000 годзе. Раман Ягелінскі запрапанаваў вырашыць справу палюбоўна — зубр астанецца ў Спале, а ў Белавежу трапіць ягоная копія. Прафінансаваць выкананне рэплікі зубра і змяшчэнне яе ў Звярынцы абавязалася Польская тэлекамунікацыя С.А. Тым часам выявілася, што ніхто не ўсведамляў сабе, што помнік зубра ў Спале не меў дагэтуль свайго гаспадара. Толькі 1 студзеня 2001 года ўзяў яго на ўлік Фонд адпачынку працоўных у Спале. Сам помнік, як сцвярджае Анджэй Кабальчык, старшыня Таварыства сяброў Піліцы і Надпілічча, па прычыне шматгадовага недагляду, выклікае сёння прыгнятальнае ўражанне. У даволі шматлікіх месцах помнік моцна паіржавелы.

Польская тэлекамунікацыя С.А. справілася са сваімі абяцаннямі, але, неспадзявана для белавежцаў, помнік пастаўлены быў у... Гайнаўцы. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 16 верасня 2001 года. Насуперак ранейшым абяцанням аказалася, што гэта не копія помніка са Спалы, толькі новы праект, які апрацаваў мастак Ян Сюта.

І калі ўжо ўсе ўсумніліся ў тым, што ў Звярынцы ізноў паявіцца помнік зубру, з ініцыятывай паставіць тут новы помнік выступіў кіраўнік Асяродка зубрагадоўлі Белавежскага нацыянальнага парку мгр інж. Ежы Дацкевіч. Удалося яму давесці справу да ўдалага канца. 23 кастрычніка 2004 года адбылася ўрачыстасць адкрыцця помніка, які выканалі Багдан Кесь з Пшышовіцаў і Ежы Керскі з Холма. Быў гэта даволі моцны акцэнт, адкрываючы чарговае выданне Фестывалю прыроды „Зубровішча" і завяршаючы „Год зубра". Стужку перарэзалі былы прэм'ер-міністр Уладзімеж Цімашэвіч і тагачасны дырэктар БНП Юзэф Попель.

18 красавіка 2005 года, амаль дакладна ў семідзесятую гадавіну пажару дома ў Звярынцы, на выстаўлены паўгода раней помнік упала агромністая галіна, якая, пашкодзіла галаву звярынецкага зубра. Праз некалькі дзён пашкоджанне было выпраўлена і помнік атрымаў ранейшы выгляд. Сёння ён цешыць вока ўсіх, хто побач яго праязджае.

Варта яшчэ ўспомніць, што ў красавіку 2007 года рэдакцыя штомесячніка паляўнічых „Łowiec Polski" паклала пачатак акцыі збірання сярод паляўнічых гільз на будову помніка белавежскаму зубру. Ці гэты помнік стане ў Белавежы? Пакуль што невядома. Тым часам 14 лістапада 2007 года ў Гайнаўцы, ля ўезду ў горад вуліцай Баторыя, паявіліся макеты трох зуброў, устаноўленыя маркай „Зубр". Ой, размножылася нам апошнім часам зубрыных помнікаў!

Дзесяць гадоў выдавецкай дзейнасці

Размова з Дарафеем Фіёнікам — галоўным рэдактарам штоквартальніка „Бельскі гостінэць".

— У пачатку 2008 года мінае 10 гадоў з моманту, калі выйшаў з друку першы нумар „Бельского гостінця", які з часам стаў сур'ёзным гістарычна-культурным часопісам і знайшоў сваіх пастаянных чытачоў. У якіх умовах нараджаўся „Гостінэць" і мяняў свой воблік?

— Яшчэ ў 1996 годзе мы ў супрацоўніцтве з Яўгенам Вапам рэалізавалі частку праекта „Бельск-Падляшскі, сэрца памежжа", у рамках конкурсу „Акадэміі малых айчын". Прадбачвалася там, між іншым, выдаванне часопіса, якога змест тычыўся б гісторыі, культуры і мовы Бельшчыны, але гэтая прапанова не была тады зрэалізаваная. Крыху закінутая ідэя пачала рэалізавацца толькі два гады пазней, калі я ў Падставовай школе н-р 3 у Бельску-Падляшскім вёў краязнаўчы гурток. Спачатку „Бельскі гостінэць" меў быць школьным краязнаўчым часопісам і таму пачалі выдаваць яго ў галоўным члены школьнага краязнаўчага гуртка. У склад нашай рэдакцыі ўвайшлі Валянціна Бабулевіч, Марк Хмур, Ірэна Кулік, Давід Рошчанка, Міхал Сцепанюк, Давід Гайко і Тамаш Суліма. Найчасцей паяўляліся ў нас матэрыялы сабраныя вучнямі ў час краязнаўчых паездак, а школьны часопіс, фінансаваны бацькоўскім камітэтам, меў быць арыгінальным. Прамоцыя першага нумара адбылася 3 лютага 1998 г., якраз на „Сустрэчах «Зоркі»" ў Нарве.

— Аднак пасля часопіс страціў школьны характар і памяняўся яго змест.

— Разам з „Гостінцем" узрастаў рэдакцыйны калектыў. Нашы вучні пачалі вучыцца ў ліцэі, а пасля сталі студэнтамі, найчасцей гуманітарных спецыяльнасцей. Разам з вучнямі наш часопіс выйшаў са Школы н-р 3 і пачаў сталець, так як наша моладзь. Зараз „Бельскі гостінэць" з'яўляецца папулярна-навуковым штоквартальнікам, але бывае, што выдаецца і радчэй, так як у 2007 годзе, калі выйшаў толькі адзін нумар, затое з каляровай вокладкай.

— Памяняліся таксама аўтары...

— У нашых студэнтаў, якія ўваходзяць у рэдакцыйны калектыў, мала часу. Цяпер аўтарамі нашых тэкстаў найчасцей з'яўляюцца людзі, якія жывуць на нашых землях і не належаць да рэдакцыйнага калектыву. Артыкулы дасылаюць нам звычайныя людзі, якія расказваюць пра сваё жыццё, а іх тэксты друкуем на мове арыгінала, толькі выпраўляем памылкі.

— На працягу дзесяці гадоў на старонках Вашага часопіса закраналіся разнародныя тэмы.

— Побач гістарычных тэм мы апісвалі падзеі, якія адбываліся ў нашым „Музеі малой айчыны". Змяшчаліся матэрыялы з галіны мовазнаўства, фальклору, культуры, этнаграфіі ці краязнаўства. Змяшчаем таксама тэксты гістарычна-рэлігійнага зместу, а аўтарамі нашага часопіса з'яўляюцца айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна.

— Хаця ў назве Вашага часопіса стаіць слова „Бельскі", паяўляюцца ў вас артыкулы з іншых тэрыторый, чым Бельшчына.

— Усе дарогі на Падляшшы ў мінулым вялі ў Бельск і выходзілі з яго як у сэнсе ўмоўным, так і ў сэнсе дослоўным. Сем гістарычных шляхоў праходзіла праз Бельск, які знаходзіўся ў палове дарогі з Вільні ў Кракаў, а многа гандлёвых дарог тут крыжавалася. „Бельскі гостінэць" з'яўляецца добрым падарункам для людзей ахвотных знаёміцца са сваёй гісторыяй, культурай і традыцыяй. Аднак у нашым часопісе закранаюцца праблемы Сямятыцкай, Гайнаўскай ці Драгічынскай зямель, а таксама Брэстчыны і Камянеччыны ці нават далей распаложнага Палесся, якія знаходзяцца па-за межамі нашай краіны. Нашымі замежнымі карэспандэнтамі з'яўляюцца Анатоль Бензярук ці Георгій Мусевіч.

— Вы друкуеце артыкулы на розных мовах.

— Мы з'яўляемся бадай адзіным часопісам, звязаным з беларускай меншасцю ў Польшчы, які друкуе матэрыялы на мовах, на якіх напісалі іх аўтары. Друкуюцца ў нас артыкулы на беларускай, рускай і польскай мовах, а асаблівасцю нашага часопіса з'яўляецца змяшчанне тэкстаў на падляшскай мове беларусаў тут пражываючых або, як я яе называю, на рускай мове. Я і раней думаў прапагандаваць сваю мову, але не быў першапраходцам у гэтай галіне. Мікола Врублеўскі ў шасцідзесятых гадах апрацаваў слоўнік лексікі вёскі Храбалы, у якім знаходзіцца каля дваццаці тысяч слоў. Пераконваў ён улады БГКТ, каб карыстацца нашай мовай на пісьме і ў час школьнай адукацыі з прынцыпам, што наша мясцовая мова раўнапраўная з нашай літаратурнай беларускай мовай, але яго прапановы не былі прыняты. Спробы запісваць фальклор на мясцовай мове рабіў Мікола Гайдук. Я ў васьмідзесятых гадах запрапанаваў, каб у „Ніве" была рэдагаваная журналістамі „Падляшская старонка" на мясцовай мове беларусаў Гайнаўшчыны, Бельшчыны ці Сямятыччыны, але мая ідэя не была падтрымана.

— І Вы рашыліся свае прапановы рэалізаваць у новаствораным часопісе?

— Зараз нават на вёсках наша падляшская мова замірае і таму вельмі важна, каб яна жыла ў пісьмовым варыянце штодзённа, а не толькі ў фальклорным запісе, які становіцца ўжо мёртвым. Мы стараемся ажыццявіць гэтую ідэю ў нашым часопісе і гэтым самым аставіць падарунак наступным пакаленням. Узорам для пісьмовага запісу з'яўляецца слоўнік Міколы Врублеўскага, апрацаваны на падставе Храбалоў.

— Аднак храбалоўская гутарка розніцца ад варыянтаў нашай мовы, якія можна пачуць каля Ласінкі, Чаромхі ці ў іншых нашых мясцовасцях.

— Самая вялікая колькасць свядомых беларусаў у Польшчы якраз жыве на Падляшшы, на тэрыторыі, якая па баках абапіраецца на Рыбалы, Трасцянку, Гайнаўку і Кляшчэлі. Калі ў нас апрацаваны дваццацітысячны слоўнік храбалоўскай мовы, вельмі характэрнай для гэтага абшару, можна ўзяць яе як узор для пісьмовага запісу.

— Для рэалізацыі розных ідэй побач ангажаванасці людзей патрэбныя яшчэ фінансавыя сродкі. Адкуль Вы атрымліваеце грошы на выдаванне „Гостінця"?

— Калі часопіс выйшаў з бельскай „тройкі", мы карысталіся грантамі Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча — Беларусь, а адзін нумар прафінансавала сям'я айца Рыгора Сасны. У 2003 і 2005 гадах мы атрымлівалі дафінансаванне з Ваяводскага самаўрада, а ад 2006 года атрымліваем дафінансаванне з бюджэту горада Бельск-Падляшскі, хаця ў гэтым годзе фінансаванне часопіса яшчэ не вырашанае.

— Вы з'яўляецеся галоўным рэдактарам часопіса, але патрэбная Вам дапамога ў яго рэдагаванні.

— Я займаюся падборкай матэрыялаў, а карэктурай займаюцца мая жонка Альжбета і сястра Аня. Мы выдаем „Гостінэць" тыражом 500 экземпляраў.

— Хутка адбудзецца прамоцыя кніжкі „Горад Бельск" аўтарства Юзэфа Ярашэвіча, якая раней друкавалася ў вашым „Гостінці".

— Даследчыкі Вялікага княства Літоўскага не могуць абысціся без манументальнага трохтомніка прафесара Ярашэвіча „Вобраз Літвы". Па-за невялікімі распрацоўкамі, змешчанымі ў кніжцы Збігнева Раманюка „Студыі і матэрыялы да гісторыі Бельска" і названнем невялікай вулічкі ў Бельску іменем Ярашэвіча, прафесар у асноўным астаецца невядомым для бялышчан. Мы рашыліся ўвекавечыць прафесара Ярашэвіча, вельмі заслужанага для нашага горада, пазнаёміць жыхароў Бельска з яго асобай, а перад усім з гісторыяй нашага горада.

— Як сёння ацэньваецца кніжка прафесара Ярашэвіча пра гісторыю Бельска?

— Прафесар Юзэф Ярашэвіч нарадзіўся ў 1793 годзе ў каталіцкай сям'і шляхецкага паходжання, але разглядаючы яго публікацыі можна дайсці да вываду, што лічыў ён сябе перад усім грамадзянінам і прыхільнікам Вялікага княства Літоўскага. Станоўча ставіўся прафесар Ярашэвіч да праваслаўя, а ў яго кніжцы можам знайсці і крытычную ацэнку дзейнасці езуітаў. У сваіх работах ён абапіраўся на пісьмовыя крыніцы інфармацыі і рабіў на іх аснове вельмі правільныя метадалагічныя вывады. Яго погляды на гісторыю Бельска ці Вялікага княства Літоўскага і навуковыя вывады на гэтую тэму, да якіх дайшоў ён 150 гадоў таму, захоўваюць актуальнасць і сёння. Будучы сынам пісара бельскага магістрата, меў ён доступ да архіўных дакументаў у ратушы, якія пасля былі перавезены ў Пецярбург ці Вільню або загінулі. Кніжка прафесара Ярашэвіча была першай такой грунтоўнай навуковай манаграфіяй горада на Падляшшы.

— Ці на падставе кніжкі прафесара Ярашэвіча і пазнейшых даследаванняў можна гаварыць пра тысячагадовае мінулае Бельска-Падляшскага?

— Існаванне Бельска лічыцца з XI стагоддзя, а пісьмовыя згадкі пра Бельск паяўляюцца ў 1253 годзе. Матэрыялы знойдзеныя археолагамі сведчаць аб першапачатковай міграцыі з усходу на нашы тэрыторыі, а першапачатковым хрысціянскім веравызнаннем нашых продкаў было праваслаўе. Лічыцца, што першы касцёл узнік пры панаванні ў Княстве літоўскім Вітальда.

— Кніжка „Горад Бельск" была напісана на польскай мове.

— Мы друкуем кніжку на польскай і рускай мовах. Польскамоўная арыгінальная версія не захавалася да нашых часоў і мы вымушаны былі зрабіць пераклад з рускай мовы на польскую.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Фота Аляксея МАРОЗА



Новае выданне

З міфаў і легендаў складаецца наша гісторыя

Сяргей ЧЫГРЫН

У Супраслі выйшла з друку кніга на беларускай і польскай мовах пад загалоўкам „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга".

Справа ў тым, што летась згуртаваннем „Uroczysko" з Супрасля быў аб'яўлены конкурс паданняў, легендаў і міфаў на Гродзеншчыне і Беласточчыне. На гэты конкурс прыйшлі 53 працы. Лепшыя паданні, легенды і міфы, па ацэнцы журы, і склалі гэтую кнігу. Палова твораў надрукаваная па-беларуску, а другая палова ў перакладзе на польскую мову.

„Міфы і легенды ад Нёмана да Буга" — выданне даволі цікавае, неабходнае і каштоўнае тым, што яно сапраўды з'яўляецца значным унёскам у нашу беларускую старадаўнюю скарбніцу. Не так часта ў Беларусі выходзяць кнігі народных міфаў і паданняў, якімі беларускі народ багаты бадай што за ўсе іншыя народы свету. Мы можам яшчэ сабраць і выдаць ці не добрых 10 тамоў беларускіх паданняў, легендаў, міфаў. Вусныя апавяданні пра мінулае, пра падзеі, пра мясціны, пра людзей, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, з гадамі губляюцца, не запамінаюцца, ды ў апошні час людзей зусім іншае цікавіць і хвалюе. А беларускія паданні, легенды і міфы — найцікавейшая рэч у нашай літаратуры, культуры, фальклоры, гісторыі. У беларускіх народных паданнях і легендах выявіліся самыя найбагацейшыя фантазіі нашага народа. Любы музычны, літаратурны, сцэнічны, экранны беларускі твор, калі ён будзе аздоблены і пабудаваны на нашых нацыянальных міфах і легендах, яму гарантаваны поспех, удача і прызнанне. Галоўнае, умела выкарыстаць гэта ў сваіх творах. Таму абавязкова трэба запісваць народныя міфы і легенды, выдаваць іх для будучых пакаленняў, якія за гэтыя сабраныя беларускія народныя скарбы скажуць нам некалі вялікі дзякуй.

У Польшчы беларусы ў гэтай справе рупяцца няблага. Яшчэ ў 1970-1980-х гадах Мікола Гайдук (1933-1998) на старонках беларускага тыднёвіка „Ніва" пастаянна друкаваў краязнаўчы слоўнік, заснаваны пераважна на мясцовых легендах і паданнях, звязаных з назвамі населеных пунктаў Беласточчыны. Гэты самы Мікола Гайдук у 1997 годзе ў Беластоку выдаў кніжку „Легенды Беласточчыны". Міхась Шаховіч (1953-2000) у 1988-1990-х гадах на аснове мясцовага легендарнага матэрыялу вёў рубрыку ў „Ніве", якая называлася „Жыла-была легенда". Даследаваў беларускія легенды і паданні таксама беларускі этнограф з Торуні Мар'ян Пецюкевіч (1904-1983). І гэты спіс можна працягваць.

Вядома, цікавыя кнігі паданняў, легендаў і міфаў выдаваліся і ў Беларусі, а таксама даследаванні пра іх. Але гэта найперш, дзякуючы Е. Раманаву, Я. Карскаму, П. Шэйну, А. Сержпутоўскаму, М. Дабравольскаму, М. Федароўскаму, якія некалі запісалі дзесяткі беларускіх народных паданняў і легендаў, даследавалі іх. Гэта імі сабраныя паданні ляглі ў аснову кніжкі „Бяздоннае багацце" (Мінск 1990), „Дрэва кахання" (Мінск 1993) і іншых. У 1990 годзе цікавую і арыгінальную кніжачку „Паданні Нясвіжа" выдала Клаўдзія Шышыгіна. А ў 1992 годзе Уладзімір Ягоўдзік падрыхтаваў кніжку паданняў і легендаў „Заклятыя скарбы" (мастак Аляксей Навіцкі), якая пабачыла свет накладам 200 тысяч асобнікаў і хутка разышлася. Паданні і легенды ляглі ў аснову кніг Каруся Каганца „Творы", Віталя Вольскага „Палессе", Леаніда Пракопчыка „Даўгінаўскія вёрсты", „Адкуль у вёскі імя", Уладзіміра Ягоўдзіка „Крылатая дружына", некаторых твораў Уладзіміра Караткевіча і г.д.

Кніга, якая выйшла ў Супраслі, распавядае пра легенды Нёмана і Свіслачы, Крэва, Слоніма, Ліды, Поразава, пра чалавека, які не пайшоў у неба, а ў пекле не хапіла яму месца, пра тое, як хлеб усталяваў справядлівасць, пра легенду аб плакучай вярбе і пунсовай карчме і г.д. У кнізе ідзе гаворка аб нашых нацыянальных рысах жыцця, спадзяваннях і маральна-этычных уяўленнях беларускага народа, а таксама аб душэўнай прыгажосці. Кніга лёгка і цікава чытаецца, таму што „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга" — гэта нашы маленькія гісторыі і здарэнні. А з іх, як піша адзін з аўтараў гэтага выдання Генадзь Прудзілка, складаецца гісторыя ўсёй Беларусі.

Апошнім часам усё больш і больш беларусаў з Беларусі раз'язджаюцца па свеце ў пошуках лепшай долі. Прычынай таму — мярзотная сітуацыя, што складваецца на іх Радзіме, дзе ўжо каторы год запар нязменна кіруе Аляксандр Лукашэнка. Найлягчэй за ўсё жыхарам Беларусі адправіцца на заробкі ў Расію, а дакладней — у Маскву. Многія з іх там асядаюць, каб, пэўна, ужо ніколі не вярнуцца жыць на Бацькаўшчыну. Але адсутнасць радзімы карціць і яны хочуць хоць неяк захаваць у сваім сэрцы нешта беларускае. Ну а разам рабіць гэта значна лягчэй.

Адным з сайтаў, што распавядае аб жыцці беларусаў у Расіі, з'яўляецца „Беларуская Масква", які месціцца па адрасе http://maskva.net. Не надта аздоблены ён рознымі ўпрыгожаннямі і пераважваюць на ім сіні, блакітны і белы колеры. Сайт падзяляецца на традыцыйныя тры часткі. Праўда, ёсць там адна не надта звычайная для беларускіх сайтаў рэч — ягоны аўтар не хавае свайго імя і прозвішча. А гэта даволі вядомы беларускі журналіст Віктар Дзятліковіч. „Мы тут жывем. Так здарылася, — распавядае ён пра маскоўскіх беларусаў і пра сябе. — Хтосьці імкнуўся сьвядома; хтосьці меў намер правесьці тыдзень-другі, ды вось і застаўся. У кагосьці на руках ужо і расейскі пашпарт; а хтосьці на запыт мента паказаць дакумэнты прызвычаена цягнецца ў кішэню. За сторублёўкай — бо нават рэгістрацыі няма. Ёсьць і такія, хто лічаць Маскву лепшым горадам зямлі. Не я. Бо горад гэты не зусім беларускі. Калі бліжэй да праўды, дык і зусім не беларускі. За невялікімі выключэньнямі. Сайт гэты — гід па выключэньнях. Мы за імі назіраем. Мы зьбіраем усю інфармацыю пра беларускія падзеі ў Маскве, пра месцы, дзе хоць нешта нагадвае пра Беларусь; месцы, куды можна зьвяртацца па дапамогу ды па сяброў. Ну і яшчэ зьбіраем некаторыя чужыя тэксты — пра беларускую ў Маскве гісторыю, пра апошнія падзеі, асобаў Беларускай Масквы, тэксты і дакумэнты наконт рэгістрацыі, а апошнім часам нам і літаратурныя творы дасылаюць".

Выйсці да рубрык сайта змешчаныя зверху і з левага боку выяўлення. Іх даволі шмат. Першая ж старонка, як мае быць, аддадзена пад навіны і важныя абвесткі. Праўда, яны дублююцца ў некаторых іншых рубрыках, напрыклад, такіх як „Навіны сайта", „СМІ, артыкулы" ці „Падзеі". Але гэта не псуе агульнага ўражання, бо зразумела, што кожны дзень нейкіх надта важных падзей у беларусаў на чужыне адбывацца не можа.

Вельмі цікавай падаецца рубрыка „Нашы аўтары". Нягледзячы на тое, што пакуль на гэтай старонцы месціцца адзін тэкст, прачытаць яго будзе варта многім, хто хоча ведаць погляд маскоўскага беларуса на палітычныя падзеі ў Расіі.

Найбольш карыснай з юрыдычна-прававога пункту гледжання з'яўляецца рубрыка „Юрыдычныя пытанні". Там прадастаўляецца інфармацыя аб прававых варунках знаходжання грамадзян Беларусі ў Расіі і, у прыватнасці, у Маскве. Адзіная не зусім зразумелая рэч у тым, што практычна ўсе тэксты на данай старонцы надрукаваныя на рускай мове. Няўжо беларусам у Маскве так яе не хапае?

Дарэчы, у моўным пытанні, сайт прытрымліваецца крыху дзіўных прынцыпаў. Рускія назвы перамешваюцца з беларускімі, прычым апошнія напісаныя збольшага „тарашкевіцай". Магчыма, у будучым сайт, калі ад двухмоўя няма куды дзецца, займее дзве асобныя моўныя версіі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Аптымістычны студзень

Першы месяц 2008 года пакаціўся імклівым мячыкам і, як звычайна, прынёс беларускім спартоўцам і іх прыхільнікам як няўдачы, так і прыемныя хвіліны. Заданне нашага традыцыйнага топ-параду — намінаванне лепшых, таму сканцэнтруемся на пазітыўных дасягненнях і „ахрысцім" мінулы студзень усё ж аптымістычным. Хоць заваёвы месяца прыпалі на некалькі відаў, але ж і спаборніцтваў было не так шмат.

1. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) стаў галоўным лаўрэатам адкрытага чэмпіянату Славеніі — першага турніру года з серыі „Pro Tour". У асабістым турніры ён выйграў 6 з 6 паядынкаў і ўзяў галоўны прыз.

2. Антон Кушнір (фрыстайл) упэўнена выходзіць на авансцэну з-за плячэй больш тытулаваных сяброў па камандзе. На чарговых этапах Кубка свету ў амерыканскім Лейк-Плесідзе наш акрабат двойчы ўзышоў на другую прыступку п'едэстала, заняў такое ж месца і на канадскім этапе.

3. Васіль Кірыенка (велатрэк) на этапе Кубка свету стаў шостым у гонцы па ачках, а потым здабыў сярэбраны медаль у трэкавай дысцыпліне скрэтч. Тым самым ён значна падвысіў свае шанцы на паездку ў Пекін.

4. Андрэй і Сяргей Касціцыны (хакей) імкліва выходзяць у лідэры „Манрэаль Канадыенс". Рэдкі матч у сваім першым паўнацэнным сезоне ў НХЛ браты пакідаюць пляцоўку без закінутых шайбаў ці асістэнцкіх пасаў, заваёўваючы ўсё большую прыхільнасць заўзятараў клуба.

5. Дзмітрый Дашчынскі (фрыстайл) не збіраецца саступаць маладым. Ветэран сусветнага фрыстайла ў Канадзе „прызямліўся" на трэцяй пазіцыі, дадаўшы яшчэ адну ўзнагароду ў сваю шыкоўную калекцыю.

1. Наталля Цылінская (велатрэк) на трэцім этапе Кубка свету, што прайшоў у Лос-Анжэлесе, нягледзячы на прастуду, першынствавала ў спрынце. Тым самым беларуска амаль забяспечыла сабе перамогу ў агульным заліку і месца на алімпіядзе.

2. Вераніка Паўловіч (настольны тэніс) стала сярэбранай прызёркай першынства Славеніі ў адзіночным разрадзе. Мінулы год быў для яе няўдалым, значыць, настала пара выбірацца з хваста соткі лепшых тэнісістак свету.

3. Вікторыя Азаранка (тэніс) у пары з ізраільцянкай Шахар Пеер дайшла да фіналу першага з турніраў „Вялікага шлема" — на „Australian Open" інтэрнацыянальны дуэт саступіў толькі ў матчы за тытул. Але ёсць адчуванне, што не так даўно створаная пара яшчэ дасягне на сур'ёзных спаборніцтвах першых месцаў.

4. Ала Цупер (фрыстайл) стала мацнейшай на этапе Кубка свету ў Канадзе. Нашы фрыстайлісты сапраўды знаходзяцца ў аптымальнай форме.

5. Таццяна Кастраміна і Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) на згаданым турніры ў Славеніі дасягнулі бронзавых медалёў у парным разрадзе.

У гульнёвых відах у цэнтры ўвагі быў, канешне, мужчынскі гандбольны чэмпіянат Еўропы. Скочыць вышэй галавы ў нашых не атрымалася. Цяпер яны будуць мець яшчэ адну падобную спробу — у кваліфікацыі да фінальнай часткі чэмпіянату свету бар'ерам на шляху беларусаў у выніку лёсавання стала Расія, яшчэ адзін няўдачнік еўрапершынства. А беларускія гандбалісткі ў аналагічным адборы згуляюць са Славеніяй.

У Кубку ЕКВ лакальнага поспеху дасягнуў флагман айчыннага жаночага валейбола — баранавіцкі „Атлант". У першым матчы адной чацвёртай фіналу беларускі з лікам 3:2 адолелі моцны французскі „Рошвіль". На жаль, гасцявы матч-рэванш застаецца „за кадрам" гэтага агляду, таму гаварыць пра агульны поспех выхаванак Уладзіміра Казлова пакуль рана.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

1 ☞працяг

Сацыёлаг — упаўнаважаным

хоўвання міжнародных правоў; тыя сустрэчы канчаліся дэкларацыямі, якія пасля ніколі не рэалізаваліся.

І спытаўся:

— Ці Ваяводская ўправа падпісваецца на меншасную прэсу? Ці ўпаўнаважаны чытае па-беларуску, літоўску, украінску?.. Большасць нашых праблем выказваецца на старонках меншаснага друку.

Ваявода Жыўна адказваў:

— Азнаямленне з вашай прэсай слушная справа. Павінна яна паяўляцца ў нашай установе. Прэса, аднак, гэта мала. Неабходны непасрэдны кантакт з вамі. Не буду патрабаваць ад упаўнаважанага ведання моў. Упаўнаважаны будзе, перш за ўсё, шукаць спосабаў вырашэння вашых праблем.

Спасылаючыся на пытанні прадстаўнікоў яўрэйскіх і расійскай арганізацый, сказаў:

— У пытанні пра тое, каб знайсці памяшканні для вашых арганізацый, няма ў мяне адназначнай думкі. Шмат меншасных арганізацый неяк з гэтым спраўляецца. Можа варта пакарыстацца іхнім вопытам пры гэтым пытанні. Буду размаўляць аб нейкіх юрыдычных прапановах, напрыклад, аб папраўках наконт змены парадку аўкцыёнаў.

У час размовы выплыла таксама праблема кантактаў з беларускім суседам пасля ўваходу Польшчы ў Шэнгенскую зону. Ваявода спрабаваў высветліць:

— Тэма звязаная з мяжой яшчэ не закрытая. Гэтае пытанне будзе адблакіраванае ў сакавіку. Працягваюцца перагаворы з Еўрапейскай камісіяй. Я ў пастаянным кантакце з консулам у Гродне і шукаем вінаватых канкрэтных сітуацый.

Яўген Вапа неяк пры нагодзе ўспомніў:

— Неўзабаве, мабыць, не будзем мець каго паказваць. Маладыя згэтуль з'язджаюць.

Упаўнаважаны Мацей Тэфэльскі

І спытаўся:

— Ці будуць новыя пагранпераходы?

— *Oczywista oczywistość.* Гэтая фраза тут вельмі падыходзіць. На гэтыя справы націскаюць на мяне таксама самаўрады. Гэта нялёгкая тэма, бо з'яўляемся вонкавай мяжой Еўрасаюза. Неабходнае тое, каб шляхам трансгранічнага супрацоўніцтва развіваўся наш рэгіён.

Яўген Вапа:

— На якім этапе знаходзіцца падрыхтоўка да адкрыцця пагранпераходу ў Такарах Мельніцкай гміны?

— ? Праверу гэта.

Ірэна Гаспаровіч, прадстаўніца літоўскай меншасці заклікала дапамагчы меншасцям у выкарыстанні еўрасаюзных сродкаў. Украінцы, таксама ад імя іншых меншасцей (м.інш. літоўскай), патрабавалі падтрымкі ў заснаванні ва Універсітэце ў Беластоку кафедры, якая займалася б іх культурай.

Пасля сустрэчы паставілі мы Мацею Тэфэльскаму некалькі, здавалася б, простых пытанняў:

— ***Ці ведаеце Вы беларускую мову?***

— Не завельмі. У школу я хадзіў у першую адлігу, значыць, у ваколіцах 1956 года і тады руская мова перастала быць абавязваючым прадметам. У нейкі перыяд я быў вымушаны чытаць „Ніву", пішучы аналіз адных выбараў у дзевяностыя гады. Неяк з беларускай мовай я спраўляўся. Гэтым за вельмі я не пераймаюся, бо ў Інстытуце, у якім я працую, маем некалькі асоб выдатна валодаючых беларускай мовай і, калі гэта спатрэбіцца, у пытаннях беларускай мовы знайду там дапамогу.

— ***Ці ў Вас меншасныя карані, можа, якраз, беларускія?***

— Няма ў мяне такіх. Я ўсё жыццё рухаўся па пагранічча. Па паходжанні я пазнаняк, значыць, я з прускага забору. Я больш за дваццаць гадоў жыў у Любліне, а пасля за жонкай завандраваў у Беласток, дзе знаходжуся з 1976 года.

— ***Колькі беларусаў у Польшчы?***

— У гэты момант дакладна не памятаю. Падлікі розныя, ад 150 тысяч да 300 тысяч. У нашым Інстытуце меркавалі мы, ці не правесці даследаванняў па гэтым пытанні, але гэта не было зроблена.

— ***А ў які лік Вы верыце?***

— Я тыповы навуковец і калі ёсць у мяне нейкая інфармацыя і калі я ведаю, што было гэта зроблена метадалагічна, дык тады веру.

— ***Але беларусы ў Польшчы ёсць?***

— Без сумненняў.

— ***Калі ласка, пералічыце дакладна пяць беларускіх арганізацый на Падляшшы.***

— БГКТ з панам Сычэўскім, Беларускае гістарычнае таварыства, значыць, пан Латышонак, Асацыяцыя беларускіх журналістаў, значыць, пан Вапа... *(смех)*. Далей мне пералічваць?

— ***Пан Вапа гэта, перш за ўсё, старшыня Беларускага саюза ў РП і старшыня Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва", а ў АБЖ толькі сябра.***

— Ад гадоў супрацоўнічаю з медыямі і тая асацыяцыя пана Вапы з АБЖ неяк мне засела ў памяці.

— ***Калі ласка, пералічыце дватры пастулаты, якія перадаваліся дагэтуль ўпаўнаважаным, Вашым папярэднікам.***

— Я атрымаў цэлы спісак рознага роду пастулатаў. Сярод іх было пытанне стварэння пры ваяводзе супольнай камісіі. Былі таксама пастулаты аб гарантаванні існавання нейкіх мерапрыемстваў і афармлення памяшкання, дзе ўсе меншасныя арганізацыі маглі б сустракацца і захоўваць у шырокім разуменні свае традыцыі.

— ***Якія, як Вы адчуваеце, былі вынікі гэтых усіх пастулатаў?***

— Цяжка мне, пакуль што, сказаць. Я прыглядаўся раней некаторым з гэтых праблем пры даследаваннях *(паўза)*. Пасля 1989 г. здарылася важная справа. Сталі прыкмячаць, што Польшча гэта не толькі самі палякі, што ёсць пагранічча.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Марыя ХЛЯБІЧ

Лён

Баба лён пасеяла — трэба штосьці ткаці,
У мяне ж дочак многа, трэба пасаг даці.
Лён палола, рвала, над вадой паслала,
А патом сушыла, церла і трапала.
Лён ужэ прадзецца, да ніткі вядзецца,
Баба вельмі рада: работа ўдаецца.
Снойніца ў хаці — будзем штось снаваці.
Аснавалі многа з суседкай на сполку:
Будзе нам на кужаль, будзе на настолку.
Кросны ўстаўляюць, аснову навіваюць,
Павесілі нічальніцы, узоры накідаюць.
Да асновы трэба і вуток дадаці,
Чаўнікам закідаці, бердам прыціскаці.
Палатно пачынае на навой завівацца,
Мы з суседкай рады, што будзе ўдавацца.
Пашыемо, суседко, міламу сарочку,
Настолкамі абдарым і сына, і дочку.
Калі дочкі будуць настолкі засцілаці,
Успомняць, як на іх цяжка працавала
наша маці.
Дарастаюць унукі, бабка ўцеху мае:
Можа, унук чы ўнучка
з настолкі скарыстае?
Вазьмі, унучка міла, каб ты памятала,
Як твая бабуля на настолку працавала.
Бабулі настолка ў шафе залягае,
А ўнучка „плямаадпорну" на стол засцілае!..

Адгаданка

					1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17
						18	19	20	21	22
			23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40	41
					42	43	44	45	46	47

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — кітайскую прыказку.

1. прылада для ўзважвання = 27 _ 16 _ 19 _ 18 _;
2. газ, злучэнне трох атамаў кіслароду, які выкарыстоўваецца для ачышчальных мэтаў = 30 _ 42 _ 43 _ 21 _;
3. хімічны элемент, які складае найбольшую частку паветра = 6 _ 1 _ 2 _ 5 _;
4. адчуванне фізічнай або маральнай пакуты = 12 _ 13 _ 44 _ 22 _;
5. орган зроку = 15 _ 20 _ 29 _ 26 _;
6. поўная заплата = 7 _ 8 _ 9 _ 3 _ 4 _ 46 _ 47 _;
7. жонка Адама = 41 _ 39 _ 40 _;
8. грашовая адзінка ў Германіі = 17 _ 38 _ 10 _ 11 _;
9. слабы парыў ветру = 33 _ 45 _ 31 _ 28 _ 14 _;
10. напрыклад, шчупак = 34 _ 32 _ 36 _ 35 _;
11. лоб = 23 _ 24 _ 25 _ 37 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 52 нумара

Алыча, вецер, Вялес, дым, іба, малако, пута, чай, шыла.

Рашэнне: **Часта малое цела бывае прычалам вялікай душы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Анне Дэмянюк** з Бельска-Падляшскага і **Мікалаю Сазановічу** з Навін Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: II kwartał 26 zł. do 5 marca 2008 r; III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r.; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

1. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.
Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Накład: 2 000 egz.

Я не маляваў для грошай!

4 ☞ працяг

і паехаў у Мінск. У Беларусі, аднак, нацыянальных кадраў не хацелі. Наадварот, яны набралі ўсякіх патрызан, вайскоўцаў. Я вярнуўся адтуль і сказаў: „Усё! Не паеду ўжо ў Беларусь!"

— ***Пры ўсіх складанасцях Вам, аднак, удалося закончыць Акадэмію мастацтваў.***

— Я вярнуўся ў Рыгу і пачаў хадзіць на падрыхтоўчыя курсы да Міхала Каранецкага ў Латвійскай акадэміі мастацтваў. Пасля паступіў у Акадэмію мастацтваў, на жывапісна-педагагічны кірунак, які закончыў у 1975 годзе.

— ***Пад вокам якога майстра Вы знаёміліся з тайнамі мастацтва?***

— Настаўнікаў было некалькі. Я вучыўся ў Іманта Вецазола, Петэрыса Постажа, Эдуарда Грубэ, Уладзіміра Козіна, Конрада Убана, Эдгара Ілтнера, Эдуарда Калныня і Петэрыса Упітыса.

— ***Вы прынялі ўдзел у амаль сотні калектыўных выставах у Латвіі, Канадзе, Кітаі, Чэхіі, Румыніі, Японіі, Швецыі, Даніі... У Вас было больш за дваццаць персанальных выставак. А ці ў Мінску Вы мелі хоць адну персанальную выстаўку?***

— Ды яшчэ якую! Пад бел-чырвона-белымі сцягамі. Міністэрства культуры прыслала сюды машыну і ўсё пагрузілі, адвезлі ў Беларусь. У мяне тады было многа карцін. Выстаўку наладзілі і ў Гродне, і ў маім пасёлку Краснае Сяло, а пасля ў Мінску. На адкрыццё прыйшлі міністры, пісала прэса, паказвала тэлебачанне... А ўжо калі да ўлады прыйшоў Лукашэнка, усе кантакты парваліся.

— ***Перад намі рэалістычны партрэт Ларысы Геніюш. Вы малявалі яе з уяўлення?***

— Не, па фотаздымках. У мяне ёсць твор, калі я пісаў паэтку з натуры. У 1973 годзе, калі яшчэ я быў студэнтам, я наведаў яе ў Зэльве. Яна сядзела на ганку і пісала вершы, а я алоўкам рысаваў яе. А гэты, які бачым, я намаляваў два гады назад. Я паказаў ужо больш жаноцкую яе натуру, на ганачаку, сярод бел-чырвона-белых мальваў. Я спецыяльна зрабіў і калаўротак ззаду. Калісь Ларыса Геніюш прасіла, каб я зрабіў экслібрыс „Жанчына за калаўроткам". Яна была вялікай любіцелькай народнага рукадзелля. Гэты партрэт я абяцаў у музей у Гудзевічы. Там ужо знаходзіцца мая Зоська Верас. Пакуль няма магчымасці, каб туды адвезці карціну.

— ***Вашы творы — гэта свайго роду асаблівая галерэя абаронцаў нацыянальнай годнасці...***

— Я шмат партрэтаў прысвяціў беларускім патрыётам, менавіта Францішку Скарыну, Максіму Багдановічу, Вінцэнту Дунін-Марцінкевічу. Яны ўсе асталіся ў Беларусі. Пасля выстаўкі ў 1993 годзе я ўжо не павёз іх назад. Адны раскупілі музеі, другія я падараваў людзям.

— ***Як палітычныя змены паўплывалі на Вашае мастацтва?***

— Зараз у мяне не тыя ўмовы. Раней я менш часу прысвячаў прафесійнай працы і мог спакойна займацца мастацтвам. А зараз трэба зарабляць грошы. Усё ідзе такімі скочкамі, што няма як засяродзіцца на маляванні. Тут у мяне аднялі майстэрню, а ў гэтым падвале, дзе зараз знаходзімся, трубы часта прарываюцца, няма як трымаць карціны. Ды ў кожнай хвіліне могуць вызваліць. Зараз, у асноўным, я займаюся педагогікай.



*Рэдакцыя „Нівы" віншуе Спадара **Вячку Целеша** з 70-гадовым юбілеем !!!*

— ***У Вас асаблівы падыход да мастацтва, я сказала б, шакіруючы на сённяшні час.***

— У савецкі час я працаваў мастаком-афарміцелем на прадпрыемствах, тады мне хапала зарплаты і на кватэру, і каб пражыць, і каб заплаціць за майстэрню. Я не маляваў для грошай, я зарабляў грошы як афарміцель на прадпрыемствах, каб маляваць беларускіх патрыётаў. Свае карціны я дарыў людзям або музеям. У мяне быў адзін дэвіз: мастаку трэба ствараць карціну. А зараз не так проста набыць фарбы, рамы — усё ж дарагое. Таму маладыя мастакі робяць усё, каб выйсці на сусветны рынак.

— ***Чамусьці тут думаю пра шлях Язэпа Драздовіча?***

— Дык усе мастакі ідуць гэтым самым шляхам. Драздовіч, хоць вялікі мастак, хадзіў босы ад вёскі да вёскі, каб нешта намаляваць і каб яго твор купілі. Ён жыў на мяжы страшнай беднасці.

— ***Ваш шлях у мастацтва быў таксама складаны, амаль на мяжы немагчымага? Сёння Вы латвійскі класік экслібрыса, выкладчык Акадэміі мастацтваў, а пачыналі як чорнарабочы, пасля слесар...***

— Быць слесарам гэта не была мая ружовая мара. Я жыў на вёсцы, а там усе бацькі ведалі, што дзецям трэба ісці працаваць. Я любіў маляваць і маляваў змалку. Аднак тады не было такіх магчымасцей як сёння: дзеткі прыходзьце і малюйце! Не, трэба было думаць як далей жыць, каб зарабіць грошы. Вось і мне захацелася працаваць слесарам у цэху, дзе суха і чыста. А токарам — то ўвогуле! Я нават не марыў пра гэты фах, там прымалі толькі па блату, расійшчыну. А нас, беларусаў, вербавалі ў паўночныя шахты. У калгасах нашы людзі працавалі як рабы і яны ўцякалі куды-небудзь, як толькі была магчымасць. Я жыў у пасёлку і нас не трымалі. Я вольна ад'ехаў з бацькаўшчыны, бо там не было магчымасцей вучыцца. Маляванне? Яно ў мяне было і яно перамагло!

— ***Па кім у Вас талент?***

— Як усе мастакі, я думаў пра гэта. Мае бацькі з небагатых сялян. Бацька 1898 года нараджэння, закончыў два класы царкоўнай школы, маці з 1905 года, закончыла адзін клас. Я ў іх пытаўся ці хтосьці ў нас маляваў. Яны не ведалі. Многа гадоў пазней я нечакнна пачуў сямейную гісторыю. Нас, Целешаў, празывалі „Дзякамі", паколькі мой прадзед служыў дзячком пры царкве. Я сам яшчэ памятаю, як у нас у вёсцы стаяў стары крыж. Ён быў выбіты з каменя-вапняка, а вакол яго былі ружы. Аказваецца, гэта мой прадзед вычасаў гэты крыж.

— ***Гэтую гісторыю расказаў Вам?..***

— Брат бацькі, якому толькі ў 1980 годзе дазволілі прыехаць у Беларусь з Канады. У 1939 годзе, калі прыйшлі бальшавікі на Гродзеншчыну, дзядзьку вывезлі ў лагер.

— ***За што?***

— За тое, што быў беларусам. Ён быў кіраўніком маладзёвай суполкі, быў яшчэ пажарнікам, іграў на мандаліне. Я нават знайшоў у яго каляндар 1938 года на беларускай мове. У іх хаце збіралася моладзь, слухалі радыё. І быў там злодзей. Дзядзька аднойчы злавіў яго за руку і пабіў. Калі прыйшлі бальшавікі, злодзей адразу данёс на дзядзьку. Нагаварыў, што дзядзька кантактуе з палякамі. За гэта і вывезлі ў лагер. Пасля, чым пагібаць у шахтах, дзядзька, як многія беларусы, пайшоў ваяваць да Андэрса. Быў у Афрыцы, ваяваў пад Монтэ-Касіна і, калі скончылася вайна, ім сказалі, што можна вяртацца ў Беларусь. А хто не, мог астацца ў Англіі. Дзядзька астаўся, а тыя, што вярнуліся, назад паехалі ў лагеры. У Англіі ён ажаніўся з латышкай. Пасля яны пераехалі ў Канаду і жылі ў Таронта. Дзядзька дзейнічаў пры царкве, многія гады служыў старастам. Памёр у 1993 годзе. Я яшчэ паспеў да яго з'ездзіць.

— ***Вы старшыня Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі „Маю гонар". Скажыце некалькі слоў пра арганізацыю.***

— Аб'яднанне заснаванае ў 1991 годзе беларускімі мастакамі Латвіі, Эстоніі, Літвы, Санкт-Пецярбурга, Швецыі. У латвійскую суполку ўваходзіць 8 асоб, у літоўскую — 5, двух нашых мастакоў жыве ў Эстоніі і адна ў Швецыі. Аб'яднанне пастаянна ўдзельнічае ў выставах мастакоў нацыянальных меншасцей Латвіі і іншых краін Прыбалтыкі. Сярод нашых дасягненняў шмат агульных і персанальных выставак у Латвіі і замежжы. Раней у нас былі вялікія магчымасці ўдзельнічаць у мастацкім жыцці Беларусі.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

03.02 – 09.02

(22.03. – 20.04.) Можаш рэалізаваць мары, якія патрабуюць засяроджання і сталёвых нерваў. Падтрымка людзей. Адчыняцца ўсе дзверы, у якія пагрукаеш. Фундаментам сапраўднага кахання з'яўляецца сяброўства.

(21.04. – 21.05.) У першых днях спрыяе табе шчасце. Удалае падарожжа. 5-9.02. адкрыюцца новыя магчымасці, увядзеш сур'ёзныя змены. 7.02. пазбягай кантактаў з шэфам, сыходзь з дарогі шкоднікам.

(22.05. – 22.06.) Дагаворышся з партнёрам, знойдзеш кампрамісны выхад з кожнай цяжкай сітуацыі. Старайся рабіць усё дакладна і не павучай іншых. Зважай на здароўе. 6-9.02. можаш непатрэбна не зрабіць чагосьці, што было б для цябе карысным (прытым пачуццё самоты і страх).

(23.06. – 23.07.) Мілыя размовы з сябрамі. Цудоўна ў пары. Затое благі ўплыў гэтых дзён на пазыкі, крэдыты, страхоўкі, капіталаўкладанні (не афармляй нічога ў банках і не слухай людзей, якія ў нічым не разбіраюцца).

(24.07. – 23.08.) 3-7.02. адкрываюцца перад табой новыя магчымасці. Пазнаёмішся з цікавымі людзьмі, даведаешся пра справы, якіх раней не ўяўляў. Чым менш баішся новых выклікаў, тым больш дастанеш.

(24.08. – 23.09.) Будзеш самаўпэўнены, прадпрымальны. Добра пойдзе ў кантактах з людзьмі і ўстановамі. Да 5.02. магчымыя памылкі, расчараванні (можаш уперціся на штосьці нявартае або кепска разлічыць свае магчымасці).

(24.09. – 23.10.) Выразна адчуеш прыхільнасць лёсу. Шчасце цябе не пакіне. Твой арыгінальны стыль, досціп, інтэлігентнасць з'яднаюць табе сімпатыю новых людзей і калег.

(24.10. – 22.11.) Могуць дакучаць табе папрокі сумлення, няладнае самаадчуванне. 7.02. над тваёй сям'ёй павіснуць чорныя хмары (будзе турбаваць цябе здароўе блізкай асобы; на шчасце, сітуацыя толькі будзе выглядаць пагрозліва). Шукай шчасця ў латарэі (увесь месяц!!!).

(23.11. – 22.12.) Адрэкамендуеш сябе з найлепшага боку. Будуць за табой проста шалець! Збудуеш сабе фінансавае заплечча. Будзеш спрытны, зарыентаваны ў карысных прапановах. Не ўваходзь у палеміку з кіраўніцтвам!

(23.12. – 20.01.) Беспамылкова ацэніш усе сітуацыі. Засяроджанне на працы, дакладнасць, здаровы розум узмоцняць тваю прафесійную пазіцыю. Знакамітая матэрыяльная сітуацыя. Аматараў прыцягваеш як магніт! Зайздроснікі абмяжуюць з табою кантакты.

(21.01. – 19.02.) Нос цябе не падвядзе ў інвестыцыях і карысных інтарэсах. Свае слабасці можаш перакаваць у перавагі. Сваркі з раднёй і бунтаванне нічога не высветляць, прынясуць адно прыкрасці. 7.02. – найгоршы дзень у месяцы (будзеш як найгоршы няўдачнік, ды благі лёс хутка адвернецца).

(20.02. – 21.03.) 7.02. не падпісвай ніякіх дакументаў (каб не абмінуць важных дэталяў і шмат страціць). Ратуй свае пачуцці, нават у тэрапеўта! Сябры — як мёд на рану ў цяжкі час. Нервы, пачуццё незразумення, немагчымасці. Не марнуй энергіі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Калі не хапае працы - II

Ніва

ПРА ГМІННАЕ

Кнаразы - IV

У арлянскай Гміннай радзе

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Актуальнае палажэнне аб выбарах, якое аддае перавагу мацнейшым групоўкам, у маштабе гмін вельмі выгаднае войтам. Гэтыя чыноўнікі могуць вельмі лёгка падпарадкаваць сабе гмінныя ўправы, падбіраючы спіскі кандыдатаў у радных, а пазней правіць гмінамі пры іх адно фармальнай падтрымцы. На пасяджэннях гмінных рад кожнае пытанне ўдаецца вырашыць паводле волі войтаў.

У арлянскай Гміннай радзе, якую састаўляе 15 радных, сваё меркаванне мае толькі адзін з іх, часам двух. Апошнія ў час пасяджэнняў найчасцей маўчаць, хаця сярод іх ёсць адзін, які пастаянна войта хваліць. У народзе гэтую раду назвалі ўжо „машынкай для галасавання". Калі я аб гэтым сказаў войту, ён спытаў мяне, чаму, выбіраючы новага казначэя, я і радны Баршчэўскі галасуем інакш, ці не на злосць гэта. Адказваю тут, што наша галасаванне было прадумана і ў інтарэсе войта, каб — калі ў будучыні нешта атрымаецца не так — войт не пачуў ад гэтага працаўніка, што ўсе яго так моцна хацелі.

Мікалай Баршчэўскі з Пашкоўшчыны: „Гэта сорам браць такія камандзіровачныя!" За сталом Раман Лажэцкі са Спічкоў

Солтысы: Уладзімір Тамчук з Москаўцаў, Аляксандр Семянюк з Рыгораўцаў (ён і радны), Павел Себясевіч са Спічкоў і Уладзімір Ахрымюк з Паўлінова

На гмінных сесіях у Орлі радныя маўчаць і аднадушна галасуюць. Адбылося ўжо адзінаццаць сесій і ў прынцыпе ніхто, апрача мяне, не браў на сесіях голасу, не прадстаўляў статутных пісьмовых заявак ці запытанняў, не згадваючы пра скаргі. З самой Орлі чатырох радных, але жыхары мястэчка са сваімі справамі ідуць да мяне, бо я тых спраў не прыхаваю; здараецца, што і жыхары іншых вёсак звяртаюцца да мяне...

У 1988-2002 гадах арлянскія сесіі доўжыліся і па пяць гадзін, бо тады амаль палова Гміннай рады была ў апазіцыі. Зараз сесіі працягваюцца каля гадзіны і старшыня рады нават не робіць перапынкаў, адно гоніць парадак дня пункт за пунктам — абы хутчэй. Сесіі адбываюцца хутка і нескладана заўважыць, што некаторыя з іх загадзя па-хітрунску рэжысіраваны. А пасля ўсе да касы... Пра сквапнасць на грошы сведчыць апошняе мінулагодняе пасяджэнне з 27 снежня.

Войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк запланаваў на 2008 год менш пасяджэнняў (у мінулым было 10, цяпер мае быць 7). Да таго ж запрапанаваў ён радным пераход на дагаворныя камандзіровачныя, а сабе назначыў новы аклад, і то ў максімальным памеры. Гэта абурыла ўсіх солтысаў, ды не толькі.

Галоўнымі пунктамі згаданай сесіі былі прыняцце плана працы рады і камісій, змены бюджэтаў на 2007 і 2008 гады ды — што выклікала вялікія хваляванні — вызначэнне камандзіровачных радным і акладу войту Арлянскай гміны. Радныя адкінулі маю прапанову вызначэння велічыні камандзіровачных солтысам.

Напружаная сесія пачалася ў добрым настроі большасці радных. Прапанаваныя Бюджэтна-фінансавай камісіяй новыя камандзіровачныя адобрыла большасць радных — дзевяць чалавек. Вось яны, месячныя дагаворныя аклады радных:

— старшыня рады — 750 злотаў;
— віцэ-старшыня рады — 500 зл.;
— старшыня пастаяннай камісіі — 450 зл.;
— радны (апрача згаданых) — па 400 злотаў (дагэтуль радныя атрымлівалі па 200 злотаў за кожнае пасяджэнне, столькі ж, што і старшыні пастаянных камісій).

Намеснік старшыні арлянскай Гміннай рады Антон Голуб з Дыдулёў традыцыйна пахваліў войта:

— Пасля гадовага перыяду дзейнасці войта наша гміна вяртае страчаныя ў маштабе краіны і павета пазіцыі. Інвестыцыі рушыліся пасля паўгода, але яны выкананы (аднак прамаўчаў, што не пачаўся другі этап пабудовы каналізацыі — М. М.) І зараз войта не трэба шукаць, так як гэта было раней. І лічу, што гміна не страціць, калі заплаціць за добрую працу.

— Прапанова павышэння акладу выйшла ад радных, — сказаў Пётр Сэльвесюк (ад згаданага Антона Голуба — М. М.). — Я ніколі за гэта не хадайнічаў, хаця гэта лічу мілым жэстам, калі нехта заўважае станоўчыя рысы маёй працы (і тут войт схлусіў, бо на амаль кожнай сесіі адзначаў, што ягоны аклад найменшы ў павеце, а ў кастрычніку кінуў заўвагу, што мае прапанову добра аплачваемай працы ў Беластоку).

Адбылося галасаванне наконт максімальнага павышэння войту месячнага акладу. Радныя прагаласавалі гэтую прапанову аднадушна, хаця яшчэ ў камісіі былі на гэты конт разыходжанні. Войт атрымае асноўную плату 4 630 зл. (дагэтуль было 3 800), функцыйны дадатак 1 550 зл. (было 1 300), спецыяльны дадатак вартасцю 40% ад сумы згаданых кампанентаў — 2 472 зл. (было 25% вартасцю ў 1 275 зл.), дадатак за працоўны стаж — 6% (дагэтуль было 228 зл.). Войту належаць таксама іншыя кампаненты акладу самаўрадавых работнікаў.

Выступае старшыня Гміннай рады Аляксандр Клін (заадно і солтыс Крывятыч); сядзіць віцэ-старшыня Антон Голуб

— Па-мойму, — сказаў Пётр Сэльвесюк, — гэта абавя-

працяг ☞ II

9 770546 196000

Калі не хапае працы

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Праца з'яўляецца — хаця не ўсе гэта ўсведамляюць, — найважнейшым зямным дабром, абавязкам і сэнсам існавання. Беспрацоўныя, пазбаўленыя гэтага дабра, цяжка пакутуюць. Цану працы найлепш ведаюць тыя, што вельмі хацелі б працаваць, але не маюць такой магчымасці. Бо праца, а дакладней — зарплата за яе, з'яўляецца найважнейшай справай для ўтрымання сям'і.

Праца горкая, але хлеб ад яе салодкі, — кажа народная прыказка. Цяпер тыя, што маюць працу, сталі яе больш шанаваць, перасталі на яе круціць носам, і здараецца, што працадаўцы іх празмерна выкарыстоўваюць. Некаторыя людзі двояцца і трояцца, дарабляюць дзе ўдасца, шабашнічаюць, выконваюць інтэрвенцыйныя работы, выязджаюць у замежжа — абы толькі не бракавала хлеба. Іншыя разводзяць рукамі, разлічваючы на сціплую дапамогу сацыяльных фондаў. А ёсць і такія, якім беспрацоўе нават выгаднае (калісь іх прымушалі да работы), бо яны не працавалі і тады, калі працы было ўдоваль, ды і цяпер паразітуюць, найчасцей астаючыся на ўтрыманні аднаго са старых бацькоў.

Што характэрнае для перыяду беспрацоўя? Зараз вельмі мала людзей думае пра заснаванне сям'і, нараджаецца мала дзяцей, памірае многа старэйшых людзей, часам заўчасна паміраюць і маладыя ў выніку празмернага п'янства. І па вёсках, у тым ліку і ў гмінных цэнтрах, становіцца штораз пусцей і сумней; так справы маюцца, напрыклад, у Арлянскай гміне.

Управа гміны ў Орлі

Менш беспрацоўных

У параўнанні з мінулым годам беспрацоўе ў Бельскім павеце ўпала з 8,6% да 7,2% (стан на 1 верасня 2007 г.), у Гайнаўскім з 9,7% да 7,2%, у Сямятыцкім з 9,6% да 6,9%, у Беластоцкім з 13,9% да 11,9%, у Сакольскім з 14,9% да 13,1%, а ў цэлым Падляшскім ваяводстве з 13,1% да 10,9%. У маштабе краіны найбольшае беспрацоўе ў Вармінска-Мазурскім ваяводстве — 19,2%, а найменшае ў Вялікапольскім — 8,8%.

Бельскі павет ад некалькіх гадоў мае адзін з найменшых паказчыкаў рэгістраванага беспрацоўя — 7,2% і ў мінулым годзе быў ён найменшы за апошнія дзесяць гадоў. Гэтая прыкметная паправа з'яўляецца вынікам гаспадарчага росту. Змагацца з беспрацоўем памагаюць таксама актыўныя формы падтрымкі працаўладкавання, стажы, курсы ці датацыі на запуск гаспадарчай дзейнасці. Да канца жніўня мінулага года такую падтрымку атрымалі больш за семсот беспрацоўных Бельшчыны. Такія дзеянні сталі магчымымі дзякуючы актыўнаму здабыванню сродкаў, м.інш. з еўрасаюзных фондаў.

У параўнанні з 2006 годам вырас таксама лік прапаноў працы ад прадпрымальнікаў. Працадаўцам з тэрыторыі Бельскага павета складана знайсці работнікаў, асабліва будаўнікоў і механікаў.

У асабліва складанай сітуацыі апынуліся асобы працягла беспрацоўныя: маладыя, інваліды і жанчыны. Гэтым людзям патрэбная маштабная падтрымка: адміністрацыйная, дарадчая і фінансавая, каб даць магчымасць поўнага вяртання на працоўны рынак.

Людзі ў працаздольным узросце складаюць 57,4% ад агулу насельніцтва павета. Лік беспрацоўных за першыя восем месяцаў мінулага года ўпаў з 2 355 да 1 765 асоб, галоўным чынам у выніку працаўладкавання, паступлення на стаж і адсутнасці гатовасці паступлення на працу. У верасні на працу ўладкаваліся 32 асобы.

У ліку зарэгістраваных 1 765 беспрацоўных жанчын было 974. Звыш паловы зарэгістраваных (1 063, г.зн. 60,2%) пражывала ў самім Бельску; годам раней гэтыя лікі былі большыя — 1 339 (61%). У вёсках пражывала 35,4% агулу зарэгістраваных беспрацоўных: з Бельскай гміны 171 асоба, з Арлянскай 122, з Вышкаўскай 112, з Боцькаўскай 79, з Рудчанскай 74, з Брань-

працяг ☞ III

I ☞ працяг

У арлянскай Гміннай радзе

зацельства да яшчэ лепшай працы. Дагэтуль атрымліваў я 4 500 зл. нета, цяпер будзе на 1 300 зл. больш (на руку 5 829 зл. — М. М.).

У чарговым пункце парадку сесіі — заявы і запытанні радных — голас узяў, як заўсёды, толькі я, звяртаючы ўвагу на патрэбу добраўпарадкавання прывітальных табліц з боку Бельска, абгараджэння і паметкі сцёканапорнай станцыі па вуліцы Крывой, забытых саракагектарных залежаў гліны ў Орлі ды на знішчэнне тратуара падчас пабудовы стаянкі перад Гміннай управай.

У пункце сесіі, датычным вольных прапаноў, выступіў жыхар Орлі Аляксандр Ярымовіч, вялікі прыхільнік гаспадара гміны, які сказаў:

— Я запрапанаваў сельскай рэдакцыі Польскага тэлебачання прыняць нашага войта да конкурсу „Найлепшы войт года". Думаю, што заслужыў ён гэтага. Паспрабуйма, бо гэта будзе дармовая прамоцыя нас. Спатрэбіцца галасаванне эсэмэсамі.

Па зале пракаціўся смех, але цяжка было здагадацца ці абазначаў ён радасць, ці весялосць ад непавагі прапановы.

— Мяне вы выбралі на тое, — сказаў Пётр Сэльвесюк, — каб у гэтай гміне было нармальна. Калі наша гміна апынецца ў ліку дзесяці найлепшых у краіне, тады будзе тэлебачанне, будзе рэклама — дармова; і гэта таксама спосаб прамоцыі гміны. На тое і войт, каб выканаць гэтую працу, і тады сапраўды можна будзе прапагандаваць нашу гміну, і атрымае яна зусім іншы імідж, чым было дагэтуль.

Радасны настрой трываў да выступлення солтыса Дыдулёў Уладзіміра Голуба:

— Далі вы радным па 450 і па 400 злотаў, а солтысам то нічога?

— Гэта ўжо гарчыца пасля абеду, — азваўся віцэ-старшыня Гміннай рады Антон Голуб.

— Як жа гэта так? — абураўся солтыс.

Спрэчку хацеў спыніць старшыня Гміннай рады Аляксандр Клін, але зала гудзела, а знерваваны солтыс пытаў далей:

— Чаму солтысы нічога не атрымалі? А радныя — што яны робяць? Нічога!

Іншыя солтысы таксама сталі выказваць сваё незадавальненне і прэтэнзіі. Голас узяў войт:

— Я ведаю, што грошы выклікаюць эмоцыі. Пра іх вырашае Рада гміны. Спадару Голубу я адкажу так: солтысы ў Дубічах атрымоўваюць за ўдзел у сесіі па 15 злотаў, у Чыжах па 30 зл., у Бельску па 50 зл., а вы па 70. Калі рада прызнае, што вам належыцца падбаўка, то яна будзе (войт не заўважыў, што аклады солтысаў паменшаюць, бо на тры паменшае колькасць пасяджэнняў рады). Я не супраць гэтага, толькі трымаймася толку і прыстойнасці. Ці вы лічыце, што калі атрымаеце 100 злотаў, то будзеце лепш працаваць?

— А чаму ў іншых гмінах радныя бяруць толькі па 150 злотаў? — спытаў Уладзімір Ахрымюк, солтыс з Паўлінова.

— Бо так вырашыла рада, — адказаў віцэ-старшыня.

— Падатак ад сялян паднялі і сабе грошы бяруць, — яшчэ больш знерваваўся солтыс. — Калі вам мала па 400, то бярыце па тысячы!

У зале зноў паднялася гамана, якой я, хаця ўжо другі тэрмін з'яўляюся радным, яшчэ не бачыў. Удзельнікі спрэчкі закідалі сваім апанентам хлусню. Сітуацыю прабаваў палагодзіць Пётр Сэльвесюк:

— Падаткі падлічаны паводле цаны збожжа. Нам трэба ўзаемазразумення і супрацоўніцтва. Гэтыя грошы не будуць праедзены, але будуць прызначаны на інвестыцыі. Лепш трымацца прынятых падаткаў, а калі сапраўды хто мае фінансавыя праблемы, няхай прыходзіць да мяне і тады я іх анулірую і атрымаю кампенсацыйную субвенцыю.

— Я ад імя солтысаў, — сказала Ніна Іванюк з Маліннік. — Кожны солтыс павінен да 15 чысла кожнага месяца зрабіць падлік. Аднак гэта немагчыма, бо ў той час і пазней людзі атрымліваюць пенсіі і не кожны ўспее; а гэта пераважна бацькі, якія плацяць за сваіх дзяцей. Гавораць: 17-га ці 18-га буду мець пенсію. А ўжо 16-га тэлефануюць з гміны: Чаму не прывозіш? І калі солтыс прывязе пазней, то вялікія прэтэнзіі...

— Гэта не наша выдумка, — адказала казначэй Ірэна Ануфрыюк. — За спазненне лічаць працэнты, а я ж іх плаціць не буду.

Новыя камандзіровачныя не супакойвалі эмоцый. Радная Марыя Саевіч прыгадала, што раней старшыні камісій працавалі на грамадскіх пачатках.

— Я вам адкажу як было, — знерваваўся радны Мікалай Баршчэўскі. — Я гаварыў, што камандзіровачныя радным завялікія, але мяне ніхто не слухаў ні на камісіі, ні тут. Калі вы, спадарыня Саевіч, сядзелі ў іншым месцы, тады гаварылі, каб даць па 200 злотаў за камісію ўсім, у тым ліку і старшыням, бо вы не ведалі, што будзеце абраны на гэтую пасаду. А калі вас выбралі, то хочаце больш (мне вядома, што яна хацела падбаўкі намнога раней — М. М.). А солтысы маюць рацыю, што абураюцца!

Старшыня рады Аляксандр Клін, не дазволіўшы раднай адказаць, закрыў дыскусію і павіншаваў усіх з Новым годам.

— Я ў 1970-х гадах быў радным і ў той час ніхто не браў грошай за пасяджэнні, солтысы таксама, — сказаў Павел Себясевіч, солтыс са Спічкоў. — І не было эмоцый. А цяпер? Дарога ў Спічкі была абкошана ў мінулым годзе, а цяпер высокая трава на абочынах і, калі заняце снегам, то немагчыма будзе нам праехаць.

Па зале зашоргалі крэслы і солтысы накіраваліся да выхаду.

— Шаноўнае спадарства, пачакайце! — заклікаў войт. — Я хачу ўсім падзякаваць за гадавое супрацоўніцтва. Мінаючы год закрываем актыўным балансам, на будучы год астаецца нам мільён у бюджэце. Каб так далей! Усяго вам найлепшага, здароўя, каб вакол вас былі людзі ветлівыя, прыстойныя. Дзякуючы такім сябрам можам задавальняць нашы пажаданні і тады наша гміна будзе працаваць нармальна. Запрашаю вас на чарку шампанскага.

У залу сталі ўносіць вялікія падносы з ласункамі і шклянкамі, да паловы напоўненымі шампанскім. І тут здарылася нечаканасць, бо солтысы не прынялі войтавага запрашэння і пакінулі залу. З ласункамі і лішкам шампанскага асталіся ў зале толькі радныя.

Мяне, запісаўшага і сфатаграфаваўшага пасяджэнне, акружылі зацікаўленыя асобы. Адны настойвалі, каб пасяджэння не апісваць, а іншыя — а тых была большасць — патрабавалі прадстаўлення арлянскіх фактаў. Пасяджэнні ж гміннага самакіравання — яўныя.

Міхал МІНЦЭВІЧ

III ☞працяг скай 66 і з самога горада Браньска 78 асоб.

Паводле інфармацыі Беаты Давідзюк, дырэктар Павятой управы працы (ПУП), летась Бельскі павет атрымаў на супрацьдзеянне беспрацоўю звыш 1,7 млн. злотаў (годам раней 1,25 млн.). Агульная сума здабытых на прамоцыю працаўладкавання і прафактывізацыю сродкаў дасягнула летась у Бельскім павеце амаль 3 млн. зл. (годам раней было іх 2,3 млн.)

У апошніх двух гадах у Бельскім павеце заўважаецца недахоп працаўнікоў, асабліва ў будаўнічых прафесіях. ПУП мела 523 прапаговы субсідзіраванай працы; Управа мае таксама прапановы з-па-за Бельскага павета. Прыходзяць таксама прапановы працы з замежжа; сёлета было іх 409, а годам раней 569. Апошніх найбольш было з Чэхіі — 1 315, Ірландыі — 952, Вялікабрытаніі — 823, Кіпра — 516, Славеніі — 223, а найменш з Германіі — 11, Ісландыі — 4, Мальты — 3 і Латвіі — 1. У замежжы найбольш патрабуюць інфарматыкаў, кулінараў, апекуноў пажылых асоб, металістаў і нават аніматараў культуры.

Захады гмінных улад

Паказчык беспрацоўя ў Арлянскай гміне найбольшы ў Бельскім павеце. Паводле інфармацыі Ірэны Пішчатоўскай, спецыяліста па сацыяльных справах, у Арлянскай гміне рознымі формамі сацыяльнай дапамогі карыстаецца штораз больш людзей. У першым паўгоддзі мінулага года перыядычнымі грашовымі дапамогамі па прычыне беспрацоўя карысталася 27 асоб, 3 асобы непрацаздольныя і адна працягла хворая. Засілкі доўжыліся 3-5 месяцаў і на іх расходавана звыш 23 тысяч злотаў.

З гмінных фондаў фінансуюцца арганізаваныя Гміннай управай і Гмінным асяродкам сацыяльнай дапамогі грамадска карысныя працы. Гэтая праграма адрасаваная беспрацоўным, якія не маюць права на грашовую дапамогу, але карыстаюцца сацыяльнымі выплатамі. З 19 сакавіка да 31 кастрычніка аб'ём гэтых прац ахопліваў 3 280 гадзін рамонтных, парадкавых і гаспадарчых прац на агульную суму 19 680 злотаў.

За інфармацыяй аб інтэрвенцыйных і публічных работах звярнуўся я да войта Арлянскай гміны Пятра Сэльвесюка, які адказаў мне:

— У 2007 годзе Управа Арлянскай гміны накіравала ў ПУП 11 заявак за дафінансаванне беспрацоўных, з гэтага ліку 5 на арганізацыю інтэрвенцыйных работ і 6 — публічных. Да таго ж наша Управа падала 3 заяўкі на арганізацыю стажавых пасад у нашай Управе. Усяго ў мінулым годзе пададзена было 19 заявак на працаўладкаванне беспрацоўных, з якіх працу атрымалі 17 чалавек, а заяўкі для двух асоб былі адхілены, бо не задавальнялі яны крытэрыяў працаўладкавання.

На працаўладкаванне беспрацоўных у рамках публічных работ Арлянская гміна атрымала больш за 90 тысяч злотаў, а ў рамках інтэрвенцыйных — больш за 6,6 тысяч злотаў. У мінулым годзе ў Арлянскай гміне 17 чалавек адпрацавалі судовыя прыгаворы.

На бягучы год на грамадска карысныя працы ў бюджэце Арлянскай гміны прадбачана 9 тысяч злотаў.

Праца блізка і далёка

Да часу трансфармацыі Орля лічылася прамысловай мясцовасцю, дзе ў розных прадпрыемствах працавала каля тысячы асоб. Цяпер лік гаспадарчых суб'ектаў у гміне ўпаў і ўсяго працуе ў іх каля трохсот чалавек. Нямногія, што маюць свае машыны, даязджаюць на працу ў Бельск, а нават у Беласток. Занікае саматужніцтва. Ва ўсёй гміне цяжка было б далічыцца пяцідзесяці перспектыўных земляробаў, аднак у іх ліку ёсць некалькі вялікіх гаспадарак, у якіх па некалькі соцень гектараў угоддзяў. Ёсць некалькі свінафермаў і мабільны прыватны скупшчык жывёлы. У ліку „земляробаў" ёсць і такія, што не абрабляюць свайго невялікага поля, толькі аплачваюць страховачныя складчыны ў КРУС, каб пасля атрымаць нейкую пенсію, нават структурную.

10 снежня мінулага года ва Управе гміны адбылася сустрэча з прадстаўнікамі іспанскай фірмы Catral Export, якая на базе будынкаў былога СКРу арганізуе аддзяленне фірмы, дзе мае быць наладжана вытворчасць прадметаў з драўніны і лазы на экспарт у Заходнюю Еўропу.

Беспрацоўе ў Арлянскай гміне меншае і ў выніку выездаў за граніцу. Характэрна, што зараз няма ахвотных ехаць у Амерыку, затое толькі ў Еўропу. Людзі часта выязджаюць не дзеля нажытку там багацця, але дзеля простага пражыцця, каб не абцяжарваць тут бацькоў, якія і самі ледзь зводзяць канцы. Дагэтуль яшчэ ніхто такі з замежжа не вярнуўся, хто хваліўся б, што там разбагацеў. Найчасцей зароблены там грошы прызначаюцца на найпільнейшыя патрэбы. Цікава, што працаваць за граніцу часта выязджаюць пенсіянеры, асабліва жанчыны, якія такім чынам дапамагаюць сваім дзецям. Мая суседка некалькі гадоў працавала ў Канадзе і так там аслабла, што ледзь трымалася на нагах калі вярнулася. Тут, праз нейкі час, акрыяла. Але, усё ж такі, той выезд, мабыць, аплаціўся, бо ў яе адсутнасць упаўнаважаная сям'я атрымлівала ейную пенсію. Але здаралася і так, што асоба, якая паехала за граніцу працаваць, патрабавала пасля дапамогі бацькоў, каб мець за што вярнуцца ў Орлю.

Новыя праблемы

Беспрацоўе спараджае іншыя праблемы. Цяжкае матэрыяльнае становішча ў многіх сем'ях вядзе часта да іншага „спосабу выжывання", уцёкаў у алкаголь. У гэты капкан трапляюць старэйшыя людзі і мужчыны ў працоўным узросце, але з цьмянымі жыццёвымі перспектывамі. Зараз у крамах разнастайны алкаголь, ён даволі танны, аднак залежныя ад яго асобы бедныя і купляюць — ці то ў рамках складчыны, ці за пазычаныя грошы — толькі вырабы з ніжніх паліц. І яны ўсур'ёз заяўляюць, што дэнатурат здаравейшы ад, напрыклад, расійскай гарэлкі. Паводле ацэнкі арлянскай амбулаторыі, алкаголь з'яўляецца прычынай клопатаў са здароўем у 10% жыхароў гміны. У гміне расце таксама лік асоб, якія кваліфікуюцца да пастаяннай дапамогі на лячэнне; шмат з іх з-за празмернага п'янства. У Орлі зараз два прыватныя бары з алкаголем. Па вуліцах п'яных амаль не відаць, аднак большае лік ездакоў, затрыманых паліцыянтамі або пагранічнікамі за язду на ровары пад хмяльком. У мінулым годзе 17 асоб было за гэта засуджана адпрацаваць свае правіны, адно толькі тая праца была без зарплаты.

Мяняецца час, мяняюцца і людзі — у горшым напрамку. Цяпер курцы не частуюць ужо папяросамі, часцей просяць у другіх. І справа тут не ў нястачы — цяпер іншая культура, кожны думае пра сябе. Нават суседзі перасталі ўзаемна наведвацца, хаця часу цяпер стала больш. Багатым пастаянна ўсяго мала і яны найбольш баяцца будучыні. Бяднейшыя так не трывожацца, бо яны горшага ўжо не спадзяюцца. І можна дадаць, што цяпер вельмі хутка і часта чалавек чалавеку становіцца ваўком.

Хацела жыць...

Кастусь МЛЫНАРСКІ

Калі праз краіну праліваецца паток пратэстаў лекараў, якія дапамінаюцца вышэйшай платы, каб з годнасцю жыць, дык у сям'і С. у адной з прыпушчанскіх вёсачак на Падляшшы царыць жалобная цішыня. Напярэдадні навагодняга вечара адбылося тут пахаванне. А бяда грымнула на чалавека нечакана, быццам маланка з яснага неба. А было гэта так...

Аб хваробе Анна С. ведала даўно. Калі падавалася дамоў у студзені 2003 года пасля аперацыі паліпа на страўніку, ардынатар туберкулёзнага шпіталя заявіла мужу: „Будзем добрай думкі. Гэта не тое, што думалі" (лічылі яны, што гэта быў рак страўніка). І тут жа прыбавіла: „Але за сэрцам у гэтым узросце трэба наглядаць. Слабенькае яно". Сужонства С. былі пенсіянерамі. Не прыходзілася ім цяжка працаваць, гаспадаркай не займаліся. Адно напрадвесні і летам у агародчыку корпаліся. Бяды не трэба было аднак доўга чакаць. У пачатку сакавіка таго ж года Анна С. пачала сябе дрэнна адчуваць. Падалася затым у мясцовую амбулаторыю. Зрабілі ёй электракардыяграму. Лекар выявіла мігальную арытмію сэрца і рэкамендавала накіраванне ў шпіталь, але пацыентка адмовілася, паколькі лічыла, што кепскае самаадчуванне часовае. Але былі гэта злога пачаткі. Жанчына скардзілася надалей на задышку і боль у грудзях. 15 красавіка 2004 года падалася яна да мясцовага асяродка здароўя. Сямейнага лекара не застала. Заступаў яго лекар-пенсіянер. Пасля абследавання пасведчыў ён павышаны ціск крыві, запісаў лякарства ад сэрца. Хоць сімптомы хваробы прадказвалі накіраваць хворую ў шпіталь, аднак лекар не зрабіў такой прапановы. І так працягвалася амбулаторнае лячэнне ў лекара-пенсіянера. Анна С. адчувала сябе раз горш, іншым разам лепш. Але калі справа станаваліся сур'ёзнай, яна пагадзілася на шпітальнае лячэнне. У час чарговага візіту ў лекара, а было гэта 10 сакавіка 2005 года, лекарка дала накіраванне ў шпітальную клініку. Там пацыентку не прынялі, паколькі аргументавалі, што ў святочныя дні пацыентаў прымаюць дзяжурныя шпіталі. Анна С. падалася затым у бальніцу па вуліцы Складоўскай у Беластоку. Пасля абследавання лекар дзяжурны запісаў восем медыкаментаў ад сэрца ды сказаў ехаць дамоў. І зноў пачалася карусель з лячэннем Анны С. у мясцовай амбулаторыі. Лекар-пенсіянер запісваў адно лякарства, а шанцу на паправу не было відаць. На зломе верасня 2005 года ды лютага 2007 г. муж Анны С. тры разы выклікаў да жонкі хуткую дапамогу і заўсёды дыспетчар адказвала яму: „Да хворых выязджаем у нечаканых выпадках. З часовым кепскім самаадчуваннем хворых павінен абследаваць бальнічны дзяжурны лекар". Сямейства Анны С. апынулася ў бязвыхадным становішчы. Вымушана яно было разлічваць на дапамогу мясцовага лекара-пенсіянера, які здаваўся быць спецыялістам па ўсіх хваробах. А калі наступіў крызіс ягонага лячэння (21 траўня мінулага года) і Анну С. неабходна было накіраваць на шпітальнае лячэнне пад наглядам спецыялістаў-кардыёлагаў, дык заявіў цынічна: „Пачынаецца бестэрміновы пратэст лекараў у краіне. Шпіталі працуюць як на вострым дзяжурстве. Калі хворая не пачне сябе лепш адчуваць пасля прымянення лякарства, дык выклікайце хуткую дапамогу". 10 лістапада мінулага года Анна С. пацярпела апаплексічны ўдар. Хуткая дапамога прыехала маланкава. Хворую паклалі на неўралагічнае аддзяленне Беластоцкай паліклінікі. Лекары паставілі дыягназ: Udar niedokrwienny mózgu pod postacią niedowładu połowicznego lewostronnego. Nadciśnienie tętnicze. Napadowe migotanie przedsionków. Прафесіянальнае лячэнне, пасля выкананай кардыяверсіі, часова прыпыніла хваробу але шанцу выздараўлення лекары паліклінікі не давалі паколькі, як сказалі, не было адпаведнага лячэння сэрца ў сваім часе. Асноўная справа тычылася мігацення перадсэрдзя. Анну С. перавезлі ў павятовы шпіталь на рэабілітацыю. Калі стан хворай пачаў быць стабільным і для сям'і з'явілася іскрынка надзеі на выздараўленне, дык нечакана хворую ахапіла запаленне лёгкіх. Было гэта 23 снежня. Чатырох лекараў змагалася за жыццё Анны С. Пацыентку перавялі на аддзяленне ўнутраных хвароб. Ад пачатку да апошніх хвілін заставаліся пры хворай маці дочкі. Была яна свядомая сваёй хваробы і з сумам выказала апошнія словы: „Не хачу паміраць". На жаль, яе мара не збылася. 28 снежня 2007 г. Анна С. памерла. Для сям'і гэта быў сапраўдны ўдар напярэдадні навагодняга вечара. Муж памерлай абвінаваціў мясцовага лекара ў тым, што не накіраваў жонку ў шпіталь у сваім часе, але гэты груба заявіў: „Niech pan nie uczy ojca, jak dzieci robić!" Калі пра гэты сказ муж памерлай намякнуў дырэктару шпіталя, дык гэты з сумам адказаў, што лекар паступіў неразважна і папрасіў у мужа Анны С. прабачэння. Але ён да канца сваіх дзён не зможа прабачыць лекару памылкі, якую зрабіў ён у лячэнні ягонай жонкі.

Кнаразы налічваюць 250 жыхароў. Дамоў у вёсцы 114, у тым ліку 8 ужо пустых. Будынкі тут пакрытыя бляхай, шыферам або цэментавай чарапіцай. Сяляне мадэрнізуюць свае гаспадаркі, купляюць сельскагаспадарчыя машыны...

Сённяшні дзень і мінулае Кнаразоў

Віктар БУРА

Многа разоў даводзілася мне пабываць у Кнаразах Бельскага павета. Пры нагодзе пазнаёміўся я з многімі цікавымі гаспадарамі, няраз сядзеў за багатым сталом ды бяседаваў з прыгожымі, прывабнымі жанчынамі з выпадку розных святкаванняў. Пры сяброўскіх сустрэчах я стараўся даведацца пра сённяшні дзень і мінулае гэтай прыгожай вёскі.

Кнаразы налічваюць 250 жыхароў. Дамоў у вёсцы 114, у тым ліку 8 ужо пустых. Будынкі тут пакрытыя бляхай, шыферам або цэментавай чарапіцай. Сяляне мадэрнізуюць свае гаспадаркі, купляюць сельскагаспадарчыя машыны. Збожжаўборачных камбайнаў у вёсцы 10, у тым ліку 8 айчынных „Бізонаў" і 2 замежных марак. У распараджэнні кнаразоўскіх земляробаў знаходзіцца 84 трактароў розных марак ды шмат спадарожнічаючых ім прылад, ад плугоў, барон, культыватараў, бульбакапалак пачынаючы і на прычэпах-падборшчыках ды прэс-падборшчыках сена і саломы канчаючы. Гэтых апошніх для цюкавання маецца 10 штук, а для звівання ў рулоны — 3 штукі. Адзін гаспадар купіў сабе нават бульбаўборачны камбайн „Анна". Прагрэс выцясніў з вёскі традыцыйную цяглавую сілу — засталося толькі 8 коней. Затое вяскоўцы катаюцца на 51 аўтамашыне.

Многія гаспадары гэта высококваліфікаваныя жывёлаводы. Пяць гаспадарак спецыялізуецца ў гадоўлі малочных кароў (кожны статак налічвае да 30 штук). Малако трымаюць яны ў 600-літровых танках-малакоахаладжальніках, а сыравіну забірае ў іх аўтацыстэрнамі малочны завод. Астатнія гаспадары здаюць малако ў мясцовы пункт скупкі.

Другая частка сялян займаецца гадоўляй свіней і кароў мясных парод, вырошчваннем агародніны ў цяпліцах, якую пастаўляюць у Бельск-Падляшскі, Гайнаўку і Беласток.

У вёсцы працуюць крама з харчпрадуктамі і прамтаварамі, святліца, дзейнічаюць добраахвотная пажарная каманда і гурток вясковых гаспадынь, якому старшынюе Марыя Барысюк. Кнаразы — дружная вёска. Яе жыхары сваімі намаганнямі пабудавалі сабе царкоўку.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Калодзеж

У Кнаразоў цікавае мінулае. Была тут жыдоўская карчма, якую да I сусветнай вайны ліквідавалі царскія ўлады. У ёй можна было гуляць у грошы, але выйгрышы былі рэдкія, затое амаль усе ахвотнікі лёгка і хутка разбагацець мелі гарантаваны пройгрыш. Не захавалася нічога таксама ад старой кузні. Аднак стаіць калодзеж, які прыпамінае колішнюю драўляную студню, выкапаную ў 1780-1790-х гадах. Належала яна да карчмы. Ваду з яе чэрпалі жураўлём, які памясцоваму называлі „пругло". Да 1950 года калодзеж служыў усім жыхарам вёскі. Паілі пры ім коней таксама прыезджыя і гандляры. Бралі ваду ў пасудзіны сяляне, ідучы ў поле. Калодзеж быў глыбокі на 10 метраў.

www.orthphoto.net

Хата Івана Ляшука

Стары драўляны калодзеж праіснаваў да 1950 года. Тады ў Кнаразах заснавалі калгас, старшынямі якога былі Карп Крыспінюк (1950-1955), Фёдар Лаўранюк (1955-1956) і Ян Ваўранюк (1956). Апошні старшыня намагаўся навесці ў калгасе парадак, прагнаць п'яніц, зладзеяў і абібокаў, але восенню 1956 года ў выніку падпалу збожжа і сена ды палітычных змен у краіне калгас разваліўся. Але калгаснае кіраўніцтва паспела заваліць драўляную студню і каля яе выкапаць для сваіх патрэб калодзеж з бетоннымі кольцамі. Цяпер стаіць ён запушчаны на ўскраіне вёскі.

На маю думку, калодзеж павінен стаць помнікам мясцовай мінуўшчыны. Дзеля гэтага трэба яго аднавіць, устанавіць пры ім журавель для чарпання вады. Праз пасрэдніцтва „Нівы" звяртаюся да Салэцкай рады, радных Бельскай гміны, солтыса і кнаразоўскай моладзі з заклікам не дазволіць, каб калодзеж разбурыўся на іх вачах. Не кожная вёска можа пахваліцца такімі памяткамі даўніны. Як жа прыгожа выглядаць будуць Кнаразы, калі пры ўездзе жыхароў і турыстаў вітаць будзе адноўлены калодзеж з жураўлём, вядром і кубачкам для вады. Хай гэты калодзеж стане атракцыёнам для наведвальнікаў Кнаразоў, а не толькі размаляваная хата Івана Ляшука з надпісам на сцяне на польскай мове „Праваслаўе альбо смерць" з другога боку вёскі.

Усё перамяняецца...

Уладзімір СІДАРУК

Сіноптыкі прадвяшчалі раннюю і снежную зіму з лютымі маразамі. Неўзабаве аказалася, што снежань быў адным з цяплейшых месяцаў апошніх гадоў, ды і студзень больш прыгадвае восень, чым зіму. Мікалай Лук'янюк у допісе „Якое надвор'е ў 2008 годзе" („Ніва" № 46 ад 18 лістапада 2007 г.) рэкамендаваў весці запіскі з 12 па 23 снежня, на аснове якіх (на думку старажылаў) можна прадбачыць надвор'е на бягучы год.

Калісьці казалі, што студзень гэта самы марозны час, а трэцюю дэкаду гэтага месяца называлі „крашчэнскімі маразамі". І сапраўды, на Вадохрышча, калі праваслаўныя вернікі ішлі на Іардан пасвяціць ваду, платы трашчалі ад марозу. Памятаю гэта з дзяцінства. Пабег я аднойчы на рэчку Нурэц, якая за вёскай цячэ, па лёдзе пакоўзацца. Каля крыніцы, дзе заўжды асвячалі ваду, лёд нечакана праламаўся і я па шыю акунуўся ў вадзе. Дахаты было пад чатырыста-пяцьсот метраў. Шпарыў я дамоў па-за агародамі без аглядкі. Пакуль я апынуўся ў памяшканні, вопратка на мне стала адно камяком лёду. Маці зразу пераапранула мяне і захутала ў коўдру. А самае цікавае, што тады я не захварэў.

У 1979 годзе была ў нас „зіма стагоддзя". Маразы трашчалі ды снегам засыпала ўсю краіну. Памятаю, што ў гэты час суседка выходзіла замуж. Жаніх працаваў у Беластоку і на шлюб дабіраўся на цягніку. У Падбеллі цягнік загразе у перонах у гурбах снегу. Жыхары Кошак і Падбелля адкопвалі вагоны, а жаніх пайшоў пехатою ў Кляшчэлі па заснежаным пуці. Такую інфармацыю перадалі з Рыгораўцаў дзяжурнаму ў Чаромху. Бацькі маладухі насустрач паслалі сані і за Кляшчэлямі жаніха забралі. Аб клопатах з тадышняй зімою я пісаў у „Ніву". Чыгуначнік з Пагулянкі (адлеглай ад Чаромхі на 6 кіламетраў) на працу дабіраўся на... лыжах („На лыжах да працы", „Ніва", 25.03.1979 г.). Вось якія былі зімы.

А наконт Лук'янюковых запісак скажу такое. Ад дванаццаці гадоў у дамашнім дзённіку раблю паметкі аб надвор'і. І вось што прыкмячаю. З 12 па 23 снежня стаяла ў нас хмурнае надвор'е. Было холадна і ішоў дождж. А мароз уначы не перасягаў 5 градусаў. Вецер у асноўным быў паўднёвы, умераны. Як прадвяшчае мой сябра, вопытны земляроб, сёлета можа быць неўраджайны год. Вясна будзе працяглая ды халодная. Мала вільготнасці ў глебе. Ад пяці гадоў наглядаецца такое надвор'е як зараз. У 2002 годзе, напрыклад, на Вадохрышча (19 студзеня) было —2 градусы, а ўдзень +2 градусы. Наступныя два дні былі падобныя, ішоў дождж. У чарговых трох гадах надвор'е было больш асеннім, чым зімовым, адно ў 2006 годзе, 20 студзеня ўначы было 30 градусаў марозу, а ў дзень —22 градусы. У мінулым годзе 19 студзеня пайшоў сапраўдны лівень, а на другі дзень прабілася сонца, павеяў заходні, умераны вецер.

Якое надвор'е будзе сёлета цяжка сказаць. Паводле назіранняў можна прыйсці да высновы, што на свеце ўсё мяняецца: надвор'е, традыцыя, ды самі людзі змяняюць аблічча і ўчынкі. А наконт традыцыі прыгадаю, што і ў нас калісьці ваду асвячалі ў рацэ. У Кузаве, напрыклад, адбывалася гэта ў прылеглай да ракі крыніцы. Там збудаваны быў адмысловы, упрыгожаны ялінай памост. Вернікі мелі хвіліну задумы і рэфлексіі, калі ў шэсці падаваліся на раку. Цудоўна гэта выглядала. Зараз асвячэнне адбываецца ў царкве ў большай пасудзіне. Гэта ўжо не тое.